КУЛЬТУРА

штотыднёвая грамадска-палітычная газета | выдаецца з кастрычніка 1991 года | № 33 (1680) | 16 жніўня 2024 г.



Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый “Кліч Палесся” восьмы раз збярэ творчыя калектывы і майстроў народнага мастацтва з Гомельшчыны і Брэстчыны, а таксама гасцей з іншых куткоў Беларусі і замежжа.

Працяг тэмы на стар. 2

ПАД УВАГАЙ ПЕРШАГА

Аляксандр Лукашэнка падчас адкрыцця Замкавага комплексу “Мір” у 2010 годзе

Адноўленая сувязь часоў

Ствараючы будучыню, Беларусь беражліва захоўвае набыткі мінулага. За гады суверэннай гісторыі другое жыццё атрымалі безліч аб'ектаў спадчыны. Дзякуючы клопату дзяржавы і асабіста Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ўдалося адрадзіць многія архітэктурныя помнікі. Сярод іх асабняком стаіць візітоўка нашай краіны — Мірскі замак, уключаны ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА.

Магутнае аблічча і шыкоўныя інтэр'еры, рупліва адноўленыя па гістарычных крыніцах. Багатыя зборы прадметаў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва дзы іншых каштоўных памятак мінулага. Разнастайныя экскурсіі і культурныя імпрэзы для дзяцей і дарослых. Усё гэта прыцягвае беларусаў і замежнікаў, што хочуць дакрануцца да слаўнай гісторыі нашай зямлі, у Замкавы комплекс “Мір”. Гэты музей — адзін з самых камерцыйна паспяховых у краіне. Штогод ён прымае каля 350 тысяч турыстаў. Але ж гісторыя аднаўлення сярэднявечнага замка і стварэння ў яго сценах унікальнай установы культуры была доўгай і няпростай.

— Рэстаўрацыйныя работы пачаліся яшчэ ў 1983-м, а праз дзевяць гадоў адкрылася першая экспазіцыя ў паўднёва-заходняй вежы. Аднак працы вяліся марудна. Планы, што замак будзе цалкам адноўлены, падаваліся ўтопіяй, — расказвае вучоны сакратар музея Ігар Ложачнік. — У чэрвені 2007-га аб'ект наведаў Кіраўнік дзяржавы. Гэты візіт дазволіў паскорыць аднаўленне замка і завяршыць яго ў рэкордныя тэрміны. Да актыўнай фазы рэканструкцыі атрымалася перайсці з атрыманнем сур'ёзнага фінансавання па дзяржінвестпраграме.

Урачыстае адкрыццё Замкавага комплексу “Мір” пасля рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ адбылося 16 снежня 2010 года. Ва ўрачыстай цырымоніі ўзяў удзел Аляксандр Лукашэнка. Як адзначыў Прэзідэнт, рэканструкцыя помніка стала аднаўленнем перарванай сувязі часоў, вяртаннем шматвяковай славы нашай зямлі.

Узведзены ў пачатку XVI стагоддзя, Мірскі замак перажыў розныя эпохі, шматлікія гістарычныя падзеі. І праз адданасць адмыслоўцаў і клопат дзяржавы гэты сімвал Беларусі паўстаў нанова ва ўсёй сваёй велічы, нагадваючы як пра слаўныя, так і пра трагічныя старонкі нацыянальнага летапісу.

Родны смак

Каравай-фэст “Бацькава булка” стартуе заўтра ў Свіслачы. Сёлета свята пройдзе пад лозунгам “Мір. Гаспадар. Дабрабыт” і будзе прысвечана 30-годдзю інстытута прэзідэнцтва і 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Фестываль пройдзе ўжо чацвёрты раз. Нагадаем, што ідэя мерапрыемства нарадзілася пасля паездкі Кіраўніка дзяржавы ў Свіслацкі раён. Падчас наведвання мясцовай хлебапякарні Прэзідэнт прадэгуставаў прадукцыю і адзначыў яе добры смак. Пасля гэтага хлеб, што вырабляюць на прадпрыемстве, назвалі “Бацькавым”, а знакамітую булачку-пляцёнку — “Бацькавай булкай”. Пазней з'явіўся і адпаведны фестываль, які стаў візітоўкай не толькі Гродзеншчыны, але і ўсёй краіны.

Сёлета наведвальнікаў фэсту чакаюць не толькі традыцыйныя мерапрыемствы. Арганізатары абяцаюць пазнаёміць гасцей з унікальнымі ўзорамі хлеба, сярод якіх блакадны, манастырскі і нават касмічны. А рэкордную па памеры пляцёнку ў пяць метраў, якую змогуць прадэгуставаць усе ахвочыя, спякуць непасрэдна падчас фестывалю. Галоўнай імпрэзай стане пастаноўка, што распавядзе гісторыю пра гаспадара, які ўмее захаваць падрадак у сваёй хаце і пастаяць за Радзіму. На цырымоніі адкрыцця па традыцыі збяруць карту Беларусі з маленькіх “Бацькавых булак”.

— У фестывалях апошніх гадоў прымалі ўдзел прафесійныя калектывы па выпечцы хлеба, аматары. Сёлета мы чакаем 36 каманд з усіх куткоў краіны, якія займаюцца вырабам хлеба на прамысловай аснове. Гэта значыць пройдзе конкурс прафесіяналаў, дзе кожны жадаючы зможа паглядзець і пакаштаваць хлебныя шэдэўры. Таксама ў фестывалі прымуць удзел каля 50 пекараў-аматараў. Акрамя таго, кожны госць займее магчымасць спячы нашу фірмовую “Бацькаву булку” сваімі рукамі. Для гэтага будуць працаваць спецыяльнае абсталяванне, печы і тандыры, — адзначыў намеснік старшыні Свіслацкага райвыканкама Юрый Кулікоў.

Яшчэ адным новаўвядзеннем стане “Гаспадар-шоу”, у рамках якога пройдуць забавы і гульні: стральба з лука, майстар-клас па колцы дроў і распілоўцы бярвення, валоданні пугай. Чакаюць гасцей і тэматычныя пляцоўкі, выставы і фотазоны. Своеасаблівым магнітам для моладзі стане аўтограф-пляцоўка вядомых беларускіх цік-токераў.

Упершыню напярэдадні свята адбыўся конкурс прафесіяналаў хлебапячэння з прысваеннем асаблівага знака якасці “Бацькава булка”. Лагатып каравай-фэсту пераможцы змогуць размяшчаць на сваёй прадукцыі. Найлепшыя конкурсныя вырабы будуць прадстаўлены на выставе “Хлеб як шлях жыцця”.

Запланавана і шырокая культурная праграма. На галоўнай сцэне пройдзе канцэрт беларускіх выканаўцаў, пасля чаго грамаду чакае святочны феерверк і інтэрактыўная праграма.

Неўміручыя традыцыі

Паставіць новы рэкорд па колькасці наведвальнікаў плануюць арганізатары Міжнароднага фестывалю этнакультурных традыцый “Кліч Палесся”. Брэндавая падзея сёлета парадуе гасцей як звыклымі ўлюбёнымі мерапрыемствамі, так і навінкамі-сюрпрызамі.

У імпрэзах паўдзельнічаюць творчыя калектывы і рамеснікі Прыпяцкага Палесся з васьмі раёнаў Гомельскай вобласці, чатырох — Брэсцкай і з Пінска. У фармаце рэвю яны пазнаёмяць гасцей з поўным цыклам беларускіх каляндарных свят. Фестываль падкрэсліць самабытнасць нашай культуры.

Запланаваныя выступленні аўтэнтычных калектываў, тэматычная лакацыя “Палессе — край партызанскі”, конкурсы ды іншыя забавы. За тытул “Палеская прыгажуня” падчас фэсту будуць спаборнічаць 13 дзяўчат з Гомельскай і Брэсцкай абласцей. Удзельніцы прадэфілююць у строях беларускіх дызайнераў, прадэманструюць аратарскае, акцёрскае і харэаграфічнае майстэрства.

На набярэжнай Прыпяці разгорнуцца інтэрактыўныя рамесніцкія пляцоўкі і тэматычныя падворкі розных раёнаў Гомельшчыны і Брэстчыны. Там жа запрацуюць выставы, дзіцячыя пляцоўкі, кінатэатр пад адкрытым небам. Акрамя іншага, будзе магчымасць пакатацца па Прыпяці на цеплаходзе і маторных лодках, наведаць сафары-парк і музей прыроды Нацыянальнага парку “Прыпяцкі”. Асобна пройдзе фестываль “Хлеб майго Палесся”, дзе кожны ахвочы зможа паўдзельнічаць у працэсе выпечкі хлеба або набыць гатовы выраб. Свае самабытныя работы прэзентуюць і ўдзельнікі адкрытага конкурсу-пленэру драўлянай скульптуры “Ажыўшая даўніна”. Дзесяць майстроў стварылі фігуры на тэму “Людзі на балоце”, якія адлюстроўваюць гісторыю запаветнага краю і традыцыйны ўклад жыцця палешукоў.

Яркім фіналам свята стане гала-канцэрт удзельнікаў і пераможцаў рэгіянальнага конкурсу вакальных ансамбляў і харавых калектываў народнай манеры выканання “Кавер-ХорШоу 2024”.



Ірына Карповіч, начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры:

— Наша фестывальная геаграфія пашыраецца, лічба фестываляў пастаянна расце. За год у краіне праходзіць каля пяцісот значных мерапрыемстваў. Але мы нацэльваемся не на колькасць, а на іх папулярызацыю і якасць. З задавальненнем запрашаем гасцей і заклікаем беларусаў актыўна падарожнічаць па сваёй краіне, адкрываць яе з розных бакоў, атрымліваць асалоду ад нашай багатай культуры.

Няхай усім правіць баль

Баль “Бібліятэчнае лета” ўпершыню прайшоў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Ён сабраў усіх, хто любіць музыку і кнігі, танцы і прыгожыя ўборы.

...Шум сталіцы застаўся недзе далёка за зачыненымі дзвярыма. Дамы ў раскошных сукенках папраўляюць прычоскі. Працягваюць рукі ў доўгіх пальчатках кавалерам — для прывітальных пацалункаў. Мужчыны ў бездакорных касцюмах галантна падтрымліваюць спадарожніц пад локаць. Музыка вальса пад высокімі скляпеннямі. Пары лунаюць амаль бясшумна — толькі ледзь улоўны шолах сукенак нагадвае ўзмах крылаў матылькоў. Неверагодная атмасфера!

— У Мінск прыехалі танцавальныя калектывы з розных гарадоў, каб паказаць маштабную танцавальную праграму. Гэта гомельскі “Сярэбраны век”, магілёўскі “Серпанцін”, бабруйскі “Паланэз”, а таксама сталічныя Dancing time і “Мінская зорка”: на першы баль у нашу бібліятэку завітала каля 100 падрыхтаваных танцораў, — распавяла загадчык сектара аналітычнай інфармацыі па культуры і мастацтве Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі **Ніна Літвінка**.

Баль пачаўся з грацыёзнага выхаду на гранд-марш. Першы танец — традыцыйны паланэз. У праграму ўвайшлі таксама цыганская полька, беларускія кракавяк і карапет, маскоўская кадрыля, вальс-гавот і іншыя танцы.

Зацікаўленыя госці маглі і самі павучыцца танцаваць — прафесіяналы прапанавалі ім майстар-класы. А паміж танцавальнымі аддзяленнямі працавалі розныя пляцоўкі. Зала беларускай літаратуры прадставіла майстэрню рэстаўратара. У зале нотных і аўдыявізуальных дакументаў можна было паслухаць гучанне вінілавых кружэлак. Зала дакументаў па мастацтве запрасіла на экскурсію па кніжна-ілюстрацыйнай выставе “Жывапісец танцорак”, прысвечанай Эдгару Дэга. Застацца сам-насам з унікальнай і рэдкай кнігай можна было ў Музеі кнігі. А ў галерэі “Лабірынт” працавала музычна-літаратурная гасцёўня: паэты чыталі свае творы ў суправаджэнні жывой музыкі раяля. Цікава было зазірнуць і ў бальны салон, каб правесці час за традыцыйнымі шашкамі і шахматамі, паўдзельнічаць у дэтэктыўных гульнях “Шэрлак Холмс” і “Знікненне на французскім прыдворным балі XVIII стагоддзя”.

Харэограф **Вольга Санельнікава** з 1979-га працуе з дзецьмі. Педагог упэўненая: культуру ў людзях трэба развіваць з самага ранняга ўзросту. А апошнія 12 гадоў Вольга Міхайлаўна выступае яшчэ і ў ролі суарганізатара баляў. Напрыклад, адзін з іх прайшоў у Косаўскім замку — 43 бліскуча выкананыя танцы ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра Брэсцкага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Р. Шырмы. “Танец — дзівоснае мастацтва, якое спалучае ў сабе музыку, харэаграфію, тэатралізацыю. Без яго ўвогуле не ўяўляю сваё жыццё, — прызнаецца Вольга Санельнікава. — Як кажуць, калі ты сёння не танцаваў, то пражыў дзень дарма”.

Мінчане **Эвеліна Літвінская і Аляксандр Бісярын** не маглі прапусціць першы баль у Нацыянальнай бібліятэцы — знакавую для беларускага мастацтва падзею. Да заняткаў танцамі партнёры прыйшлі па-розному. Эвеліна яшчэ ў дзяцінстве займалася ў балетнай школе, потым з вялікім задавальненнем сумяшчала вучобу ў інстытуце культуры з удзелам у танцавальным клубе “Мара” пад кіраўніцтвам Лідзіі Кац-Лазаравай. А праз пэўны час захапілася бальнай культурай. Аляксандр жа ўпершыню выйшаў на танцпляц усяго два гады таму. Айцішнік па прафесіі, ён вельмі любіць гісторыю. Удзел у бальнай супольнасці лічыць цудоўнай магчымасцю вывучаць яе такім незвычайным, цікавым і эстэтычным спосабам.

Уменнем арганізаваць вялікую колькасць людзей у адзіны калектыў валодае, бясспрэчна, **Тамара Георгіеўна Кузьмічова**. Яна кіруе ансамблем бальнага і гісторыка-бытавога танца “Сярэбраны век” Гарадскога цэнтра культуры г. Гомеля. У калектыве займаюцца каля паўсотні чалавек ва ўзросце 50+. І на мінулым балі многія з іх не толькі ўражвалі гледачоў прыгажосцю выступлення, але і навучалі танцавальнаму мастацтву ахвочых.

Іна Якавец прывяла на баль 9-гадовую дачку **Ілону**, якая два гады займаецца балетам у Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжы і марыць пра вялікую сцэну. І маці, і дзяўчынка ў захапленні ад мерапрыемства, лічаць, што такія імпрэзы заўсёды натхняюць. Таму дзякуючы яго арганізатарам і чакаюць новы баль — як і іншыя ўдзельнікі.

З нарады

Чарговая апаратная нарада першага намесніка міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерыя Грамады з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 13 жніўня. Дзякуючы сродкам відэасувязі ўдзел у нарадзе прынялі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

На пасяджэнні былі разгледжаныя пытанні пра дапрацоўку закона “Аб унясенні змяненняў у Кодэкс аб культуры”, пра ход выканання праграмы “Культура Беларусі” па выніках работы за першае паўгоддзе, пра прапановы магчымых змяненняў у палажэнні аб конкурсе на найлепшае ўпраўленне культуры, аб кадравым забеспячэнні і падрыхтоўцы спецыялістаў у сферы культуры, аб выкананні фінансава-эканамічных паказчыкаў тэатральна-відовішчнымі арганізацыямі за студзень — ліпень 2024 года, а таксама аб выкананні фінансава-эканамічных паказчыкаў сферай культуры за першае паўгоддзе.

Ангеліна Самалётава

Таленты — на сцэну!

Прадстаўнікоў Беларусі на конкурсе выканаўцаў моладзевай песні XVII Фестывалю “Моладзь — за Саюзную дзяржаву” вызначылі ў сталіцы. Адборачны этап адбыўся на гэтым тыдні ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі пры падтрымцы Міністэрства культуры.

У спаборніцтве прынялі ўдзел салісты з усіх рэгіёнаў краіны. Падчас адборачнага туру яны выканалі па дзве песні на рускай і беларускай мовах. Паводле ўмоў конкурсу, адна кампазіцыя ў рэпертуары прэтэндэнтаў павінна раскрываць патрыятычную тэму, а другая — адлюстроўваць сучасныя тэндэнцыі. Вакальныя даныя і выканальніцкае майстэрства кандыдатаў ацэньвала прафесійнае журы, у складзе якога працавалі вядомыя педагогі і дзеячы культуры. Па выніках адборачнага тура нашу краіну на конкурсе прадставяць Ангеліна Самалётава, Яраслава Сокал, Міхайліна Хвясюк, Андрэй Цуба, Надзея Дзегцярова, Дар'я Часлаўская, Вікторыя Касцюкова і Арцём Палкін.

“Моладзь — за Саюзную дзяржаву” — гэта творчы і адукацыйны фестываль, накіраваны на стварэнне адзінай культурнай прасторы Саюзнай дзяржавы, умацаванне сяброўства паміж моладдзю Беларусі і Расіі, а таксама на выяўленне і падтрымку таленавітых выканаўцаў. Сёлета мерапрыемства пройдзе з 11 па 15 верасня ў Смаленску. Цягам тыдня адбудуцца ўрачыстыя цырымоніі адкрыцця і закрыцця, вызныя канцэрты, тэматычныя праграмы, сустрэчы з ветэранамі, вечары сяброўства.

Слухаць, чуць, дапамагаць

Ніводны зварот не застанецца без увагі

Работа са зваротамі грамадзян — адзін з найважнейшых напрамкаў дзейнасці ўсёй сістэмы дзяржкіравання Рэспублікі Беларусь. Яна забяспечвае абарону правоў і законных інтарэсаў людзей, садзейнічае павышэнню якасці іх жыцця і стварэнню ўмоў для развіцця.
Аб тым, як арганізавана гэта праца ў Міністэрстве культуры, "К" гутарыць з начальнікам аддзела арганізацыйнай работы і дакументаабароту Аленай Быкавай.

— Алена Васільеўна, па дапамогу якога характару людзі часцей за ўсё звяртаюцца ў Міністэрства культуры?

— Прававая пісьменнасць грамадзян нашай краіны дастаткова высокая. Сёння любы чалавек можа знайсці нарматыўна-прававы акт, які яго цікавіць, і азнаёміцца з ім на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь, на сайтах дзяржаўных органаў і арганізацый, у тым ліку Міністэрства культуры. Але не ўсе могуць самастойна разабрацца з асаблівасцямі дакумента ў кантэксце сваёй канкрэтнай сітуацыі. Міністэрства культуры ж фарміруе дзяржаўную палітыку ў сферы культуры, і асноўныя пытанні, якімі займаюцца нашы спецыялісты, звязаны з распрацоўкай і зацвярджэннем нарматыўных прававых актаў. Таму, звяртаючыся да нас, людзі просяць растлумачыць, як прымяніць той ці іншы акт на практыцы.

— Якімі нарматыўнымі дакументамі вы кіруецеся ў рабоце са зваротамі грамадзян?

— Безумоўна, адным з галоўных дакументаў для дзяржаўных органаў і арганізацый з'яўляецца Дырэктыва Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2006 г. №2 "Аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату і павышэнні якасці забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва". У адпаведнасці з патрабаваннямі гэтай Дырэктывы загадам міністра культуры зацверджаны графікі прыёму грамадзян і правядзення прамой тэлефоннай лініі.

— Дзе можна з імі азнаёміцца?

— На афіцыйным сайце міністэрства і на інфармацыйным стэндзе. Інфармацыя аб запланаваным правядзенні міністрам культуры асабістых прыёмаў грамадзян таксама трансляецца бягучым радком у эфіры сталічных тэлеканалаў і рэгіянальных СМІ; дадаткова прачытаць аб правядзенні супрацоўнікамі прамых тэлефонных ліній можна ў Telegram-канале міністэрства.

— Вы выкарыстоўваеце такі інструмент зваротнай сувязі з грамадзянамі, як тэматычныя тэлефонныя лініі. У чым іх асаблівасць?

— Іх праводзяць не толькі міністр і яго намеснікі, але і кіраўнікі структурных падраздзяленняў. Гэта дае магчымасць грамадзянам задаваць пытанні вузкім спецыялістам. Напрыклад, гэта могуць быць пытанні, звязаныя са звальненнем або з прадаўжэннем кантракта. Кожную сітуацыю мы дасканала вывучаем сумесна з той арганізацыяй, у якой чалавек працаваў ці хоча працаваць (у залежнасці ад пастаўленага пытання), разбіраемся, у чым канфлікт інтарэсаў. Тэматычныя тэлефонныя лініі праводзяцца кожную суботу з 9.00 да 12.00 па тэлефоне: 8 (017) 203-75-74.

— А куды грамадзяне могуць звярнуцца з пытаннямі, якія носяць даведачны характар?

— На гарачую тэлефонную лінію, якая арганізавана ў прыёмнай міністра культуры. Кантактны нумар: 8 (017) 203-75-74, рэжым работы: з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 18.00 па будзнях.

— Да каго з супрацоўнікаў Мінкульта грамадзяне могуць патрапіць на прыём?

— Прыём грамадзян ажыццяўляе міністр культуры, яго намеснікі і начальнікі найбуйнейшых структурных падраздзяленняў, па якіх больш за ўсё паступае зваротаў: Галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва, упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, аддзела па кінематаграфіі.

ДАВЕДКА Удзельная вага зваротаў, якія паступілі ў Міністэрства культуры па пытаннях арганізацыі і правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў, дзейнасці ў сферы прафесійнага мастацтва, па выніках работы за 1-е паўгоддзе склала 61%; па пытаннях захавання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі – 16%; дзейнасці ўстаноў культуры і народнай творчасці – 9%; развіцця кінематаграфіі – 7%, адукацыі – 5%.

Акрамя таго, міністр культуры Анатолій Мечыслававіч Маркевіч ажыццяўляе выязныя прыёмы грамадзян. У ходзе шасці праведзеных у гэтым годзе было разгледжана 14 зваротаў. Асноўныя пытанні датычыліся арганізацыі і правядзення конкурсаў, фестываляў, аўтарскіх выступленняў, уключэння ў рэестр арганізатараў культурна-відовішчных мерапрыемстваў, паляпшэння жыллёвых умоў, працаўладкавання. Па чатырох зваротах прыняты станоўчыя рашэнні, па астатніх заяўнікам дадзены падрабязныя тлумачэнні.

— Як вы вырашаеце пытанні, якія знаходзяцца на стыку некалькіх сфер — напрыклад, які датычыцца капітальнага рамонту аб'екта гісторыка-культурнай спадчыны?

— Ствараем міжведамасныя рабочыя групы і камісіі, падключаем спецыялістаў, якія працуюць на месцах, — прадстаўнікоў выканкамаў, цэнтраў гігіены і эпідэміялогіі, ЖКГ, МНС і інш.

— Якія пытанні часцей за ўсё змяшчаюцца ў зваротах?

— Найбольшая колькасць пытанняў, зададзеных у бягучым годзе, датычылася арганізацыі і правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва. Падова з іх — аб уключэнні юрыдычных асоб у рэестр арганізатараў КВМ, што звязана з прыняццем 19 верасня 2023 г. пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь №608 "Аб арганізацыі і правядзенні культурна-відовішчных мерапрыемстваў". Новае заканадаўства прадугледжвае работу па новых правілах; за іх парушэнне прадугледжана адказнасць, у тым ліку адміністрацыйная. Міністэрства культуры ажыццяўляе рэгулярныя маніторынгі і праверкі мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў краіне. У гэтым напрамку мы цесна супрацоўнічаем з упраўленнямі выканкамаў і Мінскага гарвыканкама. І калі грамадзяне і юрыдычныя асобы звяртаюцца па тлумачэнні, то відавочна, што яны зацікаўлены арганізаваць сваю работу так, каб яна поўнасцю адпавядала патрабаванням заканадаўства.

Яшчэ адна тэма, якая часта ўзнімаецца ў зваротах, — ахова гісторыка-культурнай спадчыны. Пытанні задаюць неабыякавыя людзі, і мы ўдзячныя ім за гэта, бо на месцах праблемы бачныя лепш і заўважыць іх можна хутчэй — напрыклад, калі ўласнікі аб'ектаў грашаць парушэннямі пры правядзенні рамонтных работ. Калі да нас паступае сігнал, мы прымаем меры: актамі, загадамі, праверкамі, прадпісаннямі, даручэннямі прыводзім дзейнасць парушальнікаў у адпаведнасць з заканадаўствам. І гэта добра. Значыць, сістэма адладжаная і працуе на выкананне прыярытэтнай у гэтым напрамку задачы — захаваць і прымножыць.

Сёлета назіраецца рост пытанняў у галіне кінавытворчасці. Грамадзяне дасылаюць сінопсісы і сцэнары, прапануюць зняць фільмы на якую-небудзь пэўную тэматыку. Адзін з такіх зваротаў быў з просьбай стварыць дакументальны фільм пра беларускі АМАП — пра добласных абаронцаў, якія з'яўляюцца ўвасабленнем законнасці, гонару і адвагі. Зараз Міністэрства культуры сумесна з Нацыянальнай кінастудыяй "Беларусьфільм" праводзіць конкурс сцэнарыяў для вытворчасці фільмаў у 2025 годзе за кошт субсідый дзяржаўным арганізацыям кінематаграфіі. У пераліку тэм, прапанаваных аўтарам, прысутнічаюць поўнаметражны фільм пра гераізм супрацоўнікаў праваахоўных органаў і тэлевізійны серыял пра беларускую міліцыю.

Міністэрства культуры адкрыта да дыялогу з грамадзянамі. Мы з падзякай прымаем інфармацыю, якая выкрывае парушэнні ў сферы заканадаўства. Вельмі цешаць дасягненні, якімі дзеляцца з намі людзі, і падзякі, якія яны адрасуюць працаўнікам сферы культуры. Калі да нас звяртаюцца — значыць, нам давяраюць і ўпэўненыя, што міністр культуры не пакіне ніводны зварот без увагі.

Святлана ЧЭКАЛАВА
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Алена Быкава

Падрабязнасці прымянення на практыцы пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19 верасня 2023 г. №608 "Аб арганізацыі і правядзенні культурна-відовішчных мерапрыемстваў" мы абмяркуем у адным з найбліжэйшых выпускаў "К" з намеснікам начальніка галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры Васілём Галаванам.

СУПРАЦОЎНІЦТВА ЯК УЗНАГАРОДА

Пра вялікі ўклад мастацкага кіраўніка Маладзёжнага тэатра эстрады Уладзіславы Арцюкоўскай і рэжысёра-пастаноўшчыка Ігара Крывулькі ў развіццё каштоўнасных і культурных арыенціраў падрастаючых артыстаў, іх духоўна-маральнае і патрыятычнае выхаванне гаворыцца ў звароце калектыву ўзорнай арт-студыі "Натхненне" СШ №20 г. Оршы імя І.А. Флёрава. Першая іх сустрэча адбылася падчас падрыхтоўкі і правядзення святочнага гала-канцэрта да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь ля стэлы "Мінск — горад-герой". "Мерапрыемства стала платформай для пашырэння творчага гарызонту калектыву. Дасведчаныя рэжысёры здолелі разглядзець у юных артыстах Аршаншчыны талент, невычэрпную любоў да творчасці, — гаворыцца ў лісце. — Затым былі запрашэнні для ўдзелу ў фестывалях «Александрыя збірае сяброў», «Вытокі. Крок ды Алімпу», святочных канцэртах у Палацы Рэспублікі, у тэлевізійным канцэрце да Дня Перамогі. Усе рэалізаваныя праекты — гэта ўвасабленне прафесіяналізму, старанна прапрацаваных і цудоўна рэалізаваных ідэй, якія нікога не пакідаюць абыякавым".

Выхаванцы ўзорнай арт-студыі "Натхненне"

ПА-ХРЫСЦІЯНСКУ

Сёлета жыхары вёсак Семежава, Кіявічы і Лешня Капыльскага раёна Мінскай вобласці звярнуліся да міністра культуры з просьбай зняць будаўнічыя рыштаванні і прывесці ў належны выгляд Свята-Успенскую царкву ў Кіявічах. Ёсць звесткі, што прыход існаваў ужо ў першай палове XVIII стагоддзя. Мураваны будынак паўстаў у канцы XIX стагоддзя.

Заяўнікі паведамілі, што ў 2006 годзе былі ўзведзены рыштаванні і пачаўся рамонт старажытнага храма. Але зрабіць здолелі няшмат, і працы спыніліся. Вяскоўцы ўжо звярталіся ў іншыя інстанцыі, але ў адказах значылася: сродкаў няма. "Сёлета жыхары вёскі сабралі грошы, спілавалі дрэвы на могілках, якія размешчаны побач з царквой. Адкрылася непрывабная карціна: стаіць вельмі прыгожая царква ў паўразбураных чорных рыштаваннях, якія ўжо пачалі падаць. Ім хутка 20 гадоў, і, прагнілыя, яны сталі небяспечнымі для людзей, якія ходзяць да магіл сваякоў", — гаварылася ў звароце.

Міністэрства культуры разгледзела калектыўны зварот, і выкладзеныя ў ім пытанні былі дэталёва вывучаны з выездам на месца прадстаўнікоў Мінкульта, Мінаблвыканкама, Капыльскага райвыканкама і Слуцкай епархіі БПЦ. Мясцовыя органы прынялі рашэнне зняць рыштаванні. Работы па дэмантажы завершаны, прылеглая да храма тэрыторыя прыведзена ў належны стан.

Таццяна Драгун з настаўніцай Вольгай Фёдараўнай Калядка і канцэртмайстрам Таццянай Аляксееўнай Камай

АЦЭНКА ПЕДАГОГАМ — ВЫДАТНА

Шмат падзяк паступае на адрас настаўнікаў і кіраўнікоў дзіцячых школ мастацтваў. Адна з іх — педагогам мінскай ДМШМ №1 імя Л.П. Аляксандроўскай. Маці выпускніцы Кацярына Віктараўна ў сваім звароце ў Міністэрства культуры падкрэсліває, што ўважлівае і чулае стаўленне дазволіла яе дачцэ ў поўнай меры праявіць свае здольнасці ў ігры на музычных інструментах. Шмат для навучэнцаў значыла і магчымасць удзельнічаць у конкурсах і гарадскіх канцэртах. "Уменне знайсці індывідуальны падыход да кожнага вучня дапамагае ім у далейшым развіцці, дзякуючы чаму нашы дзеці становяцца мэтанакіраванымі асобамі, якія ўмеюць працаваць і дабівацца запланаванага", — піша мама.

АД РАБОТНІКАЎ КУЛЬТУРЫ ЗАЛЕЖЫЦЬ МНОГАЕ

Захапленне святкаваннем ў беларускай сталіцы Дня Перамогі выказала мінчанка Анастасія Веніямінаўна ў звароце да міністра культуры. Яе парадавала, што на розных пляцоўках горада можна было бачыць прадстаўнікоў Узброеных Сіл і міліцыі, якія давалі дзецям магчымасць пазнаёміцца з працай сувязіста, сабраць аўтамат, прымерыць форму. "Усё гэта спрыяе таму, каб нашы дзеці з малых гадоў ганарыліся людзьмі такіх прафесій", — упэўнена жанчына. Яна таксама адзначыла добрае інфармаванне аб запланаваных мерапрыемствах.

Мінчанка падзякавала і за правядзенне напярэдадні свята Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі спартыўна-патрыятычнай акцыі "Да перамог гатовы!". Анастасія Веніямінаўна падкрэсліла: "Ад работнікаў культуры залежыць шмат, вы можаце ўплываць на тое, што чытаюць, глядзяць і слухаюць нашы дзеці, на тое, якімі людзьмі яны вырастуць. Дзякуем!"


Баль у Вялікім тэатры Беларусі

ДЗЯКУЙ ЗА ЭМОЦЫІ!

Балі ў Вялікім тэатры Беларусі на стары Новы год сталі добрай традыцыяй. "Гэтае мерапрыемства згуртавала мноства розных людзей: зусім маладых і старэйшых, прафесіяналаў і пачаткоўцаў, — гаворыцца ў падзяцы за яго правядзенне, якая паступіла на адрас Мінкульта. — Была праведзена грандыёзная праца па падрыхтоўцы да балю і канцэртаў. Дзякуючы таленту балетмайстра заслужанай артыстцы Рэспублікі Беларусь Юліі Дзятко больш за 130 пар змаглі неверагодна зладжана і прыгожа выканаць усе пастановачныя танцы. Эмоцыі перапаўняюць, удзельнікі дзеляцца адно з адным у чатах фатаграфіямі і відэа з мерапрыемства". Асаблівую ўдзячнасць за захаванне цудоўных традыцый Вялікага тэатра Беларусі мінчане і госці сталіцы адрасуюць генеральнаму дырэктару Кацярыне Дулавай.

Пятро ЛАМАН

Артыст, вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Паэт, перакладчык.

У 2016 годзе Пятро Ламан быў узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Гэтай узнагароды ўдастойваюцца работнікі навукі, адукацыі і культуры за выдатныя дасягненні ў прафесійнай дзейнасці, значны асабісты ўклад у развіццё і памнажэнне духоўнага і інтэлектуальнага патэнцыялу, культурнай спадчыны беларускага народа.

1949

Нарадзіўся 11 ліпеня 1949 года ў вёсцы Маласельцы Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

Сёлета Пятро Ламан адзначаў юбілей — яму споўнілася 75 гадоў.

1966

Скончыў Ярэміцкую школу, працаваў трактарыстам.

Спектакль "Несцерка" В. Вольскага — візітоўка тэатра. Пятро Ламан выконвае ў пастаноўцы галоўную ролю

У спектаклі "Сотнікаў" (Пётра Качан)

1967

З 1967 па 1971 — вучоба ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце (курс Уладзіміра Маланкіна).

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа

1971

Прыступіў да працы ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа, дзе служыць дагэтуль. Першая эпізадычная роля — у спектаклі "Снежныя зімы" паводле І. Шамякіна (брат галоўнага героя, партызан). Першая цэнтральная роля — Эймураз Джакелі ў грузінскай камедыі Н. Думбадзэ "Не трывожся, мама!".

2024

Увайшоў у склад мастацкага савета тэатра.

У ролі першага магільшчыка ў спектаклі "Гамлет"

У рэпертуары Пятра Аляксандравіча — больш за 100 бліскучых роляў. Сярод іх — Несцерка ў спектаклі В. Вольскага і Том ("Прыгоды Гекльберы Фіна" М. Твэна), Рагвалод ("Крыж Еўфрасінні" І. Масляніцынай) і Бураў ("Стрэл у тумане" па аповесці В. Быкава), Піліп Цюрын ("Яшчэ раз пра каханне" паводле В. Шукшына) і Настаўнік ("Візіт дамы" Ф. Дзюрэнмата), беларускі шляхціц Багдан Роскаш ("Хрыстос прызямліўся ў Гародні" У. Караткевіча) і Радзівіл Руды ("Чорная нявеста" А. Дударава), сіньёр Мантэкі ("Рамэа і Джульета" У. Шэкспіра) і Дзед ("Пахавайце мяне за плінтусам" паводле П. Санаева), Пясняр ("Сон на кургане" па творчасці Янкі Купалы) і многія іншыя.

За гады працы Пятро Ламан атрымаў шмат узнагарод, сярод іх — Грамата Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2006), нагрудны знак Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь "За ўклад у развіццё культуры Беларусі" (2009) і інш.

Чытанне ўрыўкаў з "Сымона-музыкі" пройдзе 21 жніўня ў Музеі Якуба Коласа.

Знак якасці: беларускае кіно

У свой стагадовы юбілей нацыянальны кінематограф не стаіць на месцы: папаўняецца скарбонка прэм'ер, развіваецца супрацоўніцтва з іншымі краінамі.

Прыярытэтным напрамкам для "Беларусьфільма" застаецца стварэнне якаснага айчыннага кантэнту. Зараз у працы на кінастудыі знаходзіцца больш за дзясятак дакументальных фільмаў, у тым ліку пра выдатных спартсменаў, генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і на іншыя тэмы агульнанацыянальнага значэння.

Працягваецца праца з анімацыяй. У чэрвені прэзентавана стужка "Мемарыяльныя комплексы Беларусі", а ў жніўні плануецца завяршэнне першага ў нашай краіне 3D-мультфільма "Песня Сірын" рэжысёра Алены Туравай. Выхад у пракат прызначаны гэтай восенню. Сёлета беларускіх гледачоў таксама парадуюць доўгачаканай прэм'ерай праекта "Чорны замак" па матывах рамана Уладзіміра Караткевіча "Чорны замак Альшанскі". На вялікія экраны карціну выпусцяць да снежня, пасля чаго яе чакае фестывальнае жыццё.

— Зусім нядаўна студыя прыняла ўдзел у Міжнародным кінафестывалі ў Мумбаі (MIFF), дзе прадставіла свае апошнія дасягненні ў дакументалістыцы, анімацыі і ігравым кіно. Фестываль таксама дапамог нам наладзіць кантакты з індыйскімі калегамі, і сёння яны ўжо вывучаюць нашу вытворчасць. Разлічваем, што гэта прывядзе да сумеснага праекта, — адзначае генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" **Юрый Аляксей**. — Таксама на дадзены момант скончаная праца над сцэнарыем сумеснага беларуска-кітайскага праекта. Варыянт тэксту накіраваны ў Міністэрства замежных спраў. На наступным тыдні чакаем дэлегацыю з Кітая, каб абмеркаваць апошнія нюансы і ў хуткім часе прыступіць да здымак.

Беларускі кінаканцэрт — тое, у чым зацікаўлены сучасны глядач. У гэтым упэўненая першы намеснік генеральнага дырэктара ўнітарнага прадпрыемства "Кінавідэапракат" Мінгарвыканкама **Вольга Дзюльдзя**. Калі айчынныя фільмы перастануць быць штучным прадуктам — толькі пытанне часу. Але ўжо цяпер аўдыторыя паказвае зацікаўленасць у якасным сваім кіно.

— Сёння мы бачым попыт на беларускія фільмы, таму частка пракату жыве ад прэм'еры да прэм'еры "Беларусьфільма", — адзначае Вольга Дзюльдзя. — Нам вельмі патрэбны айчынны кантэнт, асабліва для дзяцей.

Дакументалісты рыхтуюць цыкл фільмаў аб станаўленні беларускага кінематографа. На дадзены момант завяршаецца вытворчасць трох карцін: "Дэманстратар", "Трэст, які не лопнуў" і "Залатая эпоха". Найбольшую цікавасць уяўляе першая стужка, прысвечаная развіццю кінатэатраў на нашай тэрыторыі і зараджэнню нямога кіно.

— Мы расказваем пра пачатак вытворчасці і дэманстрацыі фільмаў у Беларусі. Гісторыя звязана з прадпрымальнікам Рыхардам Штрэмерам, які адкрыў у нашай краіне некалькі кінатэатраў і захацеў самастойна здымаць кіно. Карціна створана ў змешанай форме, дзе ігравы сюжэт, які чымсьці нагадвае салонную меладраму з напалам страсцей і дуэлямі, суседнічае з дакументальнай асновай і хранікальнымі кадрамі, — распавядае рэжысёр Яўген Сяцько.

Фільм "Дэманстратар" паказуць як у складзе трылогіі, так і асобна. Сеансы будуць праводзіцца з удзелам рэжысёра і здымачнай групы напярэдадні Дня беларускага кіно. У далейшым цыкл чакае пракатнае жыццё.

Вялікая ўвага надаецца і падрыхтоўцы да юбілейнага, XXX Мінскага міжнароднага кінафестывалю "Лістапад", які пройдзе з 1 па 8 лістапада. Прыём заявак стартаваў у красавіку. На сёння на конкурсную праграму пададзена ўжо больш за 2 тысячы фільмаў з 114 краін. Па словах выканаўчага дырэктара фестывалю **Алесі Рульковай**, гэты факт пацвярджае, што практычна ўвесь свет з вялікай ахвотай хоча паўдзельнічаць у "Лістападзе".

Сёлета форум чакаюць навацыі. Па-першае, цырымоніі адкрыцця і закрыцця пройдуць на галоўнай сцэне Палаца Рэспублікі. Па-другое, некаторыя конкурсныя праграмы "пераедуць" у новыя кінатэатры.



— Галоўнай пляцоўкай мы плануем зрабіць кінатэатр "Перамога", які гэтым летам адкрыўся пасля рэканструкцыі. Таксама конкурсныя паказы пройдуць у кінатэатры "Мір". З традыцыйных месцаў застануцца "Цэнтральны", "Піянер" і "Беларусь", — удакладняе Алеся Рулькова.

Прыём заявак на ўдзел у XXX ММКФ "Лістапад" працягнецца да 1 верасня, але адмысловцы ўжо зараз праглядаюць фільмы і фарміруюць праграму, якая мусіць здзівіць і парадаваць публіку.

Яўгенія ГАБЕЦ

Погляд маладых

Да Дня народнага адзінства каманда рэжысёра Кірыла Халецкага рыхтуе прэм'еру фільма "Культурны код".

Стужка пра значэнне трох дзяржаўных сімвалаў — герба, гімна і сцяга — будзе нацэлена на маладую аўдыторыю: школьнікаў і студэнтаў. Разам з галоўнымі героямі — выпускнікамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў — гледачы знойдуць адказ на пытанне, якую каштоўнасць маюць дзяржаўныя сімвалы нашай краіны.

Карціна будзе спалучаць ігравы і дакументальны фарматы. У фільме пабачым элементы сацыяльнага апытання, патрапім у Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці, станем удзельнікамі аўтапрабегу і акцыі "Спяваем гімн разам!" і гледачамі эксклюзіўнага выступлення Прэзідэнцкага аркестра.

Прэм'ера фільма "Культурны код" адбудзецца 5 верасня ва ўсіх кінатэатрах краіны. Перадпрэм'ерны паказ зладзяць у Дзень беларускага пісьменства ў Івацэвічах.

БеларусьФільм

СТУДИЯ ВОЕН ФИЛЬМ

Партызанскай легендзе быць!

Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" і студыя "ВаенФільм" падпісалі мемарандум аб вытворчасці фільма "Бацька Мінай".

Па словах аўтара сцэнарыя, народнага артыста Расіі Ігара Угольнікава, ідэя стварыць кінагісторыю пра Героя Савецкага Саюза, арганізатара партызанскага руху Міная Шмырова паўстала даўно. І вельмі прыемна, што зараз з'явілася магчымасць ажыццявіць задуму.

— Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, кінастудыя "Беларусьфільм" і расійскі фонд падтрымкі кінематаграфіі ўхвалілі гэтую задуму. І зараз агульнымі намаганнямі мы пачынаем падрыхтоўку да вытворчасці карціны. Напярэдадні самы адказны этап: збор здымачнай групы і кастынг выканаўцаў галоўных роляў, — патлумачыў Ігар Угольнікаў.

Генеральны дырэктар "Беларусьфільма" Юрый Аляксей нагадаў, што Расія — асноўны стратэгічны партнёр.

— Здымкі пройдуць на тэрыторыі Беларусі і Расіі. Праект раскажа пра наш агульны подзвіг і прадэманструе прыклад патрыятызму для моладзі. Стужка выйдзе на рускай мове з англійскімі і кітайскімі субцітрамі. Першыя здымкі пачнуцца ў верасні-кастрычніку ў Беларусі, — зазначыў Юрый Аляксей.

Прэм'ера фільма "Бацька Мінай. Партызанская легенда" запланавана ў рамках XXXI Мінскага міжнароднага фестывалю "Лістапад". Стужка будзе прысвечана 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Фестываль дакументальнага кіно краін СНД "Еўразія.DOC" стартуе 30 верасня.

Крыніца патрыятызму

Гомельскі абласны музей ваеннай славы малады. Ён пачаў працаваць усяго 20 гадоў таму. Скарбніцу стваралі неабыякавыя людзі, чыя ініцыятыва знайшла падтрымку ў мясцовых улад і Прэзідэнта Беларусі. З тых часоў калектыў не стамляецца апраўдваць аказаны давер. За высокія дасягненні па выніках 2023 года ўстанова была занесена на Рэспубліканскую дошку Гонару.

За доўгую і няпростую гісторыю жыхары Гомельшчыны не аднойчы мужна абаранялі свой край ад ворагаў. У 1941—1944 гадах на гэтай зямлі адбыліся дзве ключавыя бітвы, якія значна паўплывалі на зыход Другой сусветнай вайны. Менавіта тут нацысцкая армія пацярпела першае сур'ёзнае паражэнне на сушы. Воіны 63-га стралковага корпуса пад камандаваннем генерала Леаніда Пятроўскага 3 ліпеня 1941 года нечакана фарсіравалі Дняпро, нанеслі магутны контрудар і адкінулі гітлераўцаў на захад больш чым на 30 кіламетраў. У выніку наступ вермахта на гомельскім кірунку быў спынены амаль на паўтара месяца.

Яшчэ адна слаўная старонка мінуўшчыны — бітва за Дняпро. За фарсіраванне ракі звыш 500 чалавек атрымалі званне Героя Савецкага Саюза. У гэтых і многіх іншых бітвах актыўна ўдзельнічалі жыхары Гомельскай вобласці. Музей стаў своеасаблівай данінай павагі іх мужнасці і падарункам гораду да 60-годдзяПерамогі.

ЖАНОЧАЕ АБЛІЧЧА ВАЙНЫ

У памяці наведвальнікаў установы асаблівае месца займуць жаночыя імёны. Галіна Дакутовіч — штурман 46-га гвардзейскага Таманскага палка лёгкіх начных бамбардзіроўшчыкаў. Да вайны яна была адной з найлепшых беларускіх гімнастак, пісала вершы, марыла стаць лётчыцай і паступіць у акадэмію Жукоўскага. Дзяўчат туды не прымалі, і Галіна трапіла ў Маскоўскі авіяцыйны інстытут.

Аднойчы пасля палёту яна адпачывала на тэрыторыі аэрадрома. З-за высокай травы Галіну, якая ляжала на зямлі, не заўважыў кіроўца машыны-запраўшчыка і... пераехаў дзяўчыну. Тры месяцы яна прабавіла ў шпіталі, а затым, нягледзячы на невылечную траўму пазваночніка і моцныя болі, працягнула баявыя палёты.

Дзве ўраджэнкі Гомельшчыны былі ўдастоены высокай узнагароды Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа. Ваенфельчары Марыя Дарачук і Соф'я Гарохава — уладальніцы медаля імя Флорэнс Найтынгейл. Гэты рэдкі прадмет таксама прадстаўлены ў музеі.

АДМЕТНЫЯ АРТЭФАКТЫ

Хоць большая частка экспанатаў адлюстроўвае ваенную гісторыю мінулага веку, у скарбніцы можна ўбачыць і сапраўдны штурмавы салдацкі шлем XVI стагоддзя, і меч японскай імператарскай гвардыі XIX стагоддзя. Акрамя таго, Гомельскі абласны музей ваеннай славы мае вялікую калекцыю найвышэйшых дзяржаўных узнагарод: медалі Героя Беларусі і "За адвагу", ордэны Айчыны, Пашаны, Дружбы народаў, Воінскай Славы, "За службу Радзіме", "За асабістую мужнасць".

Некаторыя артэфакты ўнікальныя. Напрыклад, факсіміле Акта аб безумоўнай капітуляцыі фашысцкай Германіі і багата ўпрыгожаная пляшка з дароўным надпісам, здабытая гамяльчанінам Маньковым у бункеры Гітлера.

Ля музея, пад адкрытым небам, дэманструецца адна з самых вялікіх у Беларусі калекцый ваеннай тэхнікі. Акрамя іншага, збор уключае паравоз 1934 года з санітарным вагонам, зенітнай устаноўкай і "цяплушкай". Таксама на пляцоўцы выстаўлены самалёты: знішчальнік-бамбардзіроўшчык Су-76 і штурмавік Су-25, які ўдзельнічаў у баявых дзеяннях у Афганістане. Вядома, тут ёсць і легендарная палутарка, танкі, гарматы.

У АДНОЙ ЗВЯЗЦЫ

Установа мае два філіялы. Першы — Музей крыміналістыкі, дзе захоўваецца больш за 700 экспанатаў. Гэтыя прадметы распавядаюць пра барацьбу са злачыннасцю. Тут можна ўбачыць зброю, міліцэйскую амуніцыю і рыштунак, фрагменты кабінетаў эксперта-крыміналіста і следчага канца XX стагоддзя, службовы матацыкл "Урал", абсталяваны адмысловымі сігналымі і гукавымі прыладамі, а таксама канфіскаваныя фальшывыя дакументы і грошы, набор адмычак.

Другі філіял — мемарыяльны ваенна-гістарычны комплекс "Партызанская крынічка". Ён знаходзіцца недалёка ад Гомеля — там, дзе першапачаткова базіраваўся партызанскі атрад "Бальшавік". У гэтай мясціне рэканструявалі лагер народных мсціўцаў. Працягваецца закладзеная ў пасляваенны час традыцыя: у мемарыяльным комплексе праходзяць сустрэчы пакаленняў, на якіх моладзь знаёміцца з гераічным мінулым нашага народа.

СВЯТЫ АБАВЯЗАК

Калектыў Гомельскага абласнога музея ваеннай славы невялікі — усяго 35 супрацоўнікаў. Па словах дырэктара ўстановы **Артура Карчэўскага**, асноўнай задачай адмыслоўцы лічаць ваенна-патрыятычнае і грамадзянска-маральнае выхаванне моладзі.

— Наш святы абавязак — захоўваць гістарычную памяць, — распавядае Артур Алегавіч. — Не дазваляць скажаць праўду пра гераічнае мінулае беларускага народа. Мы павінны займацца моладдзю, расціць патрыётаў.

З пачатку года музей прыняў каля 150 тысяч наведвальнікаў. План рэгулярна перавыконваецца. Установа актыўна развіваецца. У снежні 2023-га супрацоўнікі падрыхтавалі абноўленую экспазіцыю ў мемарыяльным комплексе на месцы Азарыцкага лагера смерці, а ў чэрвені гэтага года музеефікавалі мемарыял "Ала". Цяпер сумесна з Беларускім саюзам мастакоў рыхтуюць музейную экспазіцыю ў Красным Беразе. Яна будзе, напэўна, адзінай у СНД, што цалкам прысвечана дзецям — ахвярам Вялікай Айчыннай вайны.

Віктар ГАЎРЫШ

Фота Уладзіміра ШЛАПАКА і з архіва ўстановы

Мемарыяльны ваенна-гістарычны комплекс "Партызанская крынічка"

Па лініі фронту

На Смаргоншчыне сёлета праходзяць мерапрыемствы, прысвечаныя 110-й гадавіне пачатку Першай сусветнай вайны. "К" даведалася, як супрацоўнікі мясцовага гісторыка-краязнаўчага музея захоўваюць памяць аб пякельнай пары.



Дырэктар установы **Дзіна Валодзька** адзначае, што абарона горада падчас той вайны — адна з самых трагічных старонак яго мінулага. Праз Смаргонь праходзіла лінія руска-германскага фронту, і ў пэўны момант населены пункт апынуўся ў эпіцэнтры баявых дзеянняў.

— Сапраўды, Першая сусветная вайна раздзяліла гісторыю нашага краю на "да" і "пасля", — расказвае Дзіна Уладзіміраўна. — Абаронцы Смаргоні мужна супрацьстаялі германскім захопнікам 810 дзён — з верасня 1915 па снежань 1917 года. Яшчэ да пачатку актыўных узброеных сутыкненняў большасць мясцовых жыхароў эвакуіравалі. У выніку за вайну насельніцтва Смаргоні зменшылася амаль у 100 разоў, а сам горад быў цалкам разбураны. Менавіта пад Смаргонню германская армія ўпершыню на Усходнім фронце ўжыла хімічную зброю, што прывяло да вялікіх страт як сярод салдат, так і сярод цывільных. Частка спадчыны працяглай пазіцыйнай вайны на смаргонскім участку фронту — бліндажы, капаніры і доўгачасовыя агнявыя пункты — захавалася дагэтуль. Таму тэма Першай сусветнай з'яўляецца значнай для горада і пастаянна знаходзіцца ў фокусе ўвагі нашай установы.

УНІКАЛЬНЫЯ ЭКСПАЗІЦЫІ

На сёння ў Смаргонскім гісторыка-краязнаўчым музеі налічваецца больш за 11 тысяч адзінак захоўвання асноўнага фонду і больш за 5 тысяч — навукова-дапаможнага. Істотная колькасць прадметаў мае непасрэднае дачыненне да падзей 1915—1918 гадоў.

— У экспазіцыі нашага музея Першай сусветнай вайне прысвечаны цэлы раздзел, — адзначае Дзіна Валодзька. — Прадстаўлены ўнікальныя дакументы таго часу, асабістыя рэчы радавых і афіцэраў абодвух войскаў, баявыя ўзнагароды і зброя. Цэнтральнае месца займае дыярама "Мёртвы горад". На ёй выяўлены салдат, які стаіць сярод разбуранай вуліцы. За яго спінай бачны касцёл Святога Міхаіла Архангела — адзін з нямногіх ацалелых будынкаў, пэўны сімвал непакорнасці Смаргоні.

Дырэктар музея падкрэслівае, што да 110-годдзя пачатку Першай сусветнай супрацоўнікі ўстановы падрыхтавалі эксклюзіўныя праекты. Нядаўна адкрылася экспазіцыя "Малюнкі з акопаў". У ёй прадстаўлены фатаграфіі, карціны, паштоўкі пякельнай пары, у тым ліку з калекцыі журналіста і даследчыка вайны 1914—1918 гадоў Уладзіміра Багданава.

— У маі наша ўстанова далучылася да міжнароднай акцыі "Ноч музеяў", якую традыцыйна правялі ў Крэўскім замку, — расказвае Дзіна Уладзіміраўна. — Сёлета галоўнай тэмай мерапрыемства была Першая сусветная. У адной з вежаў, дзе падчас вайны размяшчалася агнявая пазіцыя, мы адкрылі выставу, прысвечаную Крэўскай наступальнай аперацыі і абароне Крэўскага замка. Сярод экспанатаў — прадметы ваеннага побыту, фотаздымкі таго перыяду. Праект можна ўбачыць і цяпер.

БЕЛАРУСКІ ВЕРДЭН

З ініцыятывы Смаргонскага райвыканкама і пры падтрымцы Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы было прынята рашэнне аб увекавечанні памяці ахвяр Першай сусветнай вайны. Пачатак жніўня адзначыўся для горада адкрыццём мемарыяльнага комплексу па лініі супрацьстаяння рускага і германскага войскаў. Цэнтральныя элементы мясціны — скульптурныя кампазіцыі "Бежанцы", "Салдаты Першай сусветнай вайны" і "Крылаты геній салдацкай славы", а таксама капліца смутку і "Камень памяці" з пасланнем нашчадкам.

Акрамя таго, тут адбыўся ваенна-гістарычны фестываль "Беларускі Вердэн. Смаргонь у гады Вялікай вайны". У рамках мерапрыемства навуковыя супрацоўнікі музея арганізавалі выставу "Першая сусветная вайна. Трагічныя старонкі гісторыі Смаргоншчыны". Экспанаты і інфармацыйныя стэнды дапамаглі наведвальнікам паглыбіцца ў кантэкст эпохі і больш дазнацца пра мінуўшчыну горада.

— Таксама варта адзначыць, што напярэдадні фестывалю ў нашым музеі прайшоў міжнародны круглы стол "Гістарычная памяць: Першая сусветная вайна скрозь прызму часу", — кажа Дзіна Уладзіміраўна. — Яго арганізатарамі выступілі Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Смаргонскі райвыканкам. Падчас мерапрыемства гісторыкі і краязнаўцы з розных рэгіёнаў Беларусі і Расіі падзяліліся досведам працы па захаванні памяці аб падзеях Вялікай вайны, прадставілі вынікі даследаванняў.

Абаронцы Смаргоні мужна супрацьстаялі германскім захопнікам 810 дзён

ВЕДАЦЬ І ЗБЕРАГАЦЬ

Дзіна Валодзька падкрэслівае, што праз выставы, мерапрыемствы і іншыя праекты супрацоўнікі Смаргонскага гісторыка-краязнаўчага музея звяртаюць увагу грамадскасці на гісторыю рэгіёна і краіны ў цэлым. Народу, які ведае свайго мінулага, вельмі цяжка ісці ў будучыню.

— Варта памятаць, што ўзброеныя канфлікты вядуць толькі да разбурэнняў і чалавечых ахвяр. Прамым пацвярджэннем гэтага тэзіса з'яўляецца гісторыя Смаргоні першай паловы XX стагоддзя, — дзеліцца меркаваннем Дзіна Уладзіміраўна. — Таму мы павінны ведаць аб жудасных падзеях мінулага і не дапусціць іх паўтарэння на нашай зямлі. Не толькі дзеля сябе, але і дзеля будучых пакаленняў.

Даніл ПІЎКАРЭЦ

Скульптурная кампазіцыя "Крылаты геній салдацкай славы"

Руіны Смаргоні

“Жаніцьба”: шлюб ад д’ябла?

Гогалеўская “Жаніцьба” — п’еса запатрабаваная. Да спектакляў у Купалаўскім тэатры, у Брэсце, а таксама ў Магілёве (тамтэйшая версія перамагла на XVII Міжнародным форуме М.@rt.кантакт) далучылася прэм’ера ў ТЮГу — у прачытанні маладога расійскага рэжысёра, уладальніка прэміі “Залатая маска” Цімура Кулава.

На адным з фестываляў у Санкт-Пецярбургу Цімур Кулаў быў у складзе журы разам з дырэктарам нашага ТЮГа, заслужанай артысткай Рэспублікі Беларусь Верай Палякова-Макей. Так узнікла канчатковая дамоўленасць пра пастаноўку, бо шляхі калектыву і рэжысёра перасякаліся на гастролях-фестывалях і раней.

Чым цікавая прэм’ера? Найперш пашырэннем ролі персанажаў другога плана, на што звярталася асаблівая ўвага ў шматлікіх анонсах. Сапраўды, служкі цэнтральных герояў — Сцяпан з беларускім маўленнем (Дзмітрый Козел) і Дуняша (Маргарыта Кісялітэ) — атрымліваюць самастойную любоўную лінію. У п’есе яны ніяк не перасякаліся, а тут іх пачуцці развіваюцца на нашых вачах, складаючы альтэрнатыву няўдалым стасункам іх гаспадароў. Такі прыём супрацьстаўлення розных пар, уласцівы камедыям XVIII стагоддзя, стаў неад’емнай рысай нававенскай аперэты, забяспечыўшы жанру наяўнасць адпаведных лірыка-драматычных і характарна-камічных сцэн. Дастаткова згадаць, як па-рознаму перажываюць каханне Эдвін і Сільва — Боні і Стася ў “Сільве” Кальмана. Такая завуаляваная спасылка на аперэтачныя амплуа ўносіць у спектакль дадатковую гуллівую нотку. А яшчэ пераконвае, што ў галоўных герояў таксама ўсё магло быць іначай, куды больш шчаслівa.

Цэнтрам прыцягнення стала адметная сцэнаграфія Дар’і Волкавай. Амаль усю сцэну займае вялізная канструкцыя з безліччу асацыяцый, наўпрост звязаных з п’есай. Гэта і канапа, на якой праходзіць усё жыццё герояў і ад якой яны так баяцца адарвацца. І нейкі дзіўны карабель без штурвала, а значыць, плыве па цячэнні. Задняя сценка канструкцыі становіцца бар’ерам-перашкодай, і персанажы раз-пораз пералазяць-пераадольваюць яго, каб апынуцца “за сцяной”, ва ўлонні хатняга спакою і ўтульнасці. А вакол — бы чорная касмічная дзірка, дзе таксама ёсць жыццё. Ды не проста ёсць, яно там віруе: невыпадкова ж вакол гэтай канапы-карабля артысты літаральна лётаюць, максімальна развіваючы хуткасць бегу.

У спектаклі шмат цікавых прыдумак. Сваццяя Фёкла Іванаўна (Кацярына Крылова), прайшоўшы па даждкы, вылівае ваду з гумавых ботаў. Каб прадэманстраваць пасаг нявесты, паказвае графічныя малюнкі на карычневай паперы — у чамадане на колцах, што раскрываецца, бы кніжка. Дае Сцяпану грошы: “Працуй!” — і той пачынае заўзята нахвальваць нявесту. Дарэчы, гэта не адзіная фраза на манер постмадэрну, дададзеная ў мінімальна скарочаны арыгінальны тэкст. Доказам умення гаварыць па-французску гучыць: my name is, хэндэ хох. Дуняша, бы запраўскі каўбой, кідае ласо, каб выцягнуць жаніхоў. Тыя, бы ў савецкіх кінастужках, спраўна разліваюць на траіх. Сцяпан таксама закідвае вяроўку, бы свой невад у мора. Але ў адрозненне ад пушкінскага старога, вылоўлівае не залатую рыбку, а Качкарова з Падкалёсіным: тыя выходзяць, трымаючыся за вяровачку, як гэта калісьці практыкавалася ў дзіцячых садах, каб не згубіць дзіця ў час прагулкі.

Сцэны са спектакля

Нельга не вылучыць акцёрскія работы: у кожным з герояў добра адчуваецца яго характар, выяўлены не толькі праз учынкі, укладзеныя ў п’есу, але і праз асаблівасці пластыкі, маўлення. Скарыстаныя ў спектаклі падвесныя мікрафоны цудоўна перадаюць усе інтанацыі, не вымушаючы артыстаў фарсіраваць гук.

Качкароў (Андрэй Асімовіч) паўстае д’яблам-супермэнам. З’яўляецца ў атачэнні грому з маланкай, у містычным святле, з моднай прычоскай, у абрысах якой угадваюцца рожкі. Пра тое сведчаць і чырвоныя шкарпэткі, такая ж камізэлька. Гэта далёка не першае прачытанне гогалеўскага героя як чорта: ён сее містыку і ў цяперашнім магілёўскім спектаклі Сяргея Фядотава. Ды і ў колішняй пастаноўцы Саўлюса Варнаса ў тым жа тэатры Качкароў выступаў своеасаблівым Мефістофелем, спакушаючы Падкалёсіна на шлюб.

Агаф’я Ціханаўна (Вера Палякова-Макей) намаляваная спачатку пужлівай, а потым даволі рамантычнай асобай. Невыпадкова ў другой дзеі яна ў ружовай сукенцы з ружовай ружай у валасах. Але знакаміты маналог пра выбар вымаўляе з набітым ротам, звесіўшы ногі ў тоўстых ваўняных шкарпэтках. Згадваючы вусны, нос жаніхоў, раскладвае дыванкі-падушкі і падае на іх. Адмаўляючы ж прэтэндэнтам на руку і сэрца, спачатку амаль нячутна шэпча: “Пашлі прэч, дурні”, — а потым тыя ж словы крычыць з усёй сілай. А ў фінале ўвесь свой боль і роспач укладае ў мухабойку, прыпадабняючыся сваёй Цётухне (Раіса Астрадзінава ці Ларыса Горцава). І тыя мерныя ўдары асацыююцца з пахаваннем, адначасова перагукаючыся з ціканнем гадзінніка ў пачатку спектакля, што нагадвала пра няўмольнасць часу.

Падкалёсін (Уладзіслаў Вінаградаў ці ў іншым складзе Дзмітрый Клімовіч) — такі ж няўпэўнены, а потым агрэсіўны. Добра перададзены характары і намеры жаніхоў, у тым ліку праз музыку. У іх постацях ёсць не толькі камічныя, але і трагічныя рысы. Той жа Анучкін (Андрэй Каламіец ці Андрэй Каленікаў) смешна картавіць, гаворыць з акцэнтам. А праз усё гэта прабіваецца невыносная адзінота. Маналог Жавакіна (Іван Шрубейка) пра сямнаццатую нявесту кранае настолькі, што зала выбухае апладысментамі.

Тэма адзіноты ў “Жаніцьбе” таксама не новая. Па-беларуску ахінутая атмасфернай туманнасцю, яна цудоўна выяўлена ў спектаклі Данііла Філіповіча ў Купалаўскім. У пастаноўцы ж ТЮГа прынцыпова новае — агрэсія. Яе многа, ёй прасякнуты розныя сцэны.

Качкароў ужо пры першым з’яўленні душыць Фёклу, як у бандыцкіх серыялах. Бліжэй да фіналу б’е Падкалёсіна галавой аб сценку. Можа, справа ў д’ябальскай трактоўцы ролі? Але і іншыя героі небяззбройныя. Фёкла, бы дваровая гапата, уторквае кінжал у нагу Яечніцы (Леанід Улашчанка ці Іван Ушакевіч). Падкалёсін спачатку душыць Качкарова, мардуе яго. А ў фінале наўпрост застрэльвае з пісталета.

Фінал трэба бачыць на ўласныя вочы, бо ў кожнага можа быць свая трактоўка. Замест знакамітага акенца жаніх скочыць у люк пасярод “канапы”. Трапляе ў пекла? Але з таго люка з’яўляліся і іншыя, зусім не д’ябальскія персанажы. Да таго ж адтуль ідзе святло. І без аніякіх чырвоных водбліскаў. Дык Падкалёсін застрэліў д’ябла, які схіляў яго да шлюбу, і рушыць насустрач светламу шчасцю? Глядач можа дадумаць любы варыянт. А вось для нявесты такі фінал — бы скончэнне жыцця, бясспрэчна. Мужчынскі погляд на жаніцьбу? Безумоўна.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Міжнародны фестываль “Сожскі карагод” пройдзе 13—15 верасня ў Гомелі.

“Папялушка” ад бабулі

Вялікі тэатр Беларусі закрыў сезон доўгачаканай прэм’ерай балета “Папялушка” на музыку Сяргея Пракоф’ева.

Доўгачаканай, бо спачатку была запланавана пастаноўка Валянціна Елізар’ева, якая з-за хваробы майстра адклалася. Потым спектакль пачалі рыхтаваць Канстанцін Кузняцоў і Юлія Дзятко — паводле знакамітай казкі Шарля Перо, але на сваё лібрэта. Прэм’ера была заяўлена на канец чэрвеня, ды перанеслася на пачатак ліпеня. Нарэшце ўсё адбылося: тры паказы запар. Перад апошнім прайшла лекцыя запрошанага з Расіі балетнага крытыка Аляксандра Максава “Тайны і загадкі Папялушкі”.

Казка захавалася, але назваць спектакль ва ўсіх сэнсах казачным было б перабольшваннем. Нават аркестр пад кіраўніцтвам Юрыя Караваева гучаў неяк стомлена, без асаблівай яркасці фарбаў. Згаданыя ж балетмайстры-пастаноўшчыкі раней спецыялізаваліся на сучаснай харэаграфіі. І атрымлівалася гэта ў іх выдатна! А тут патрабавалася максімум неакласіка, ды яшчэ ў рамках не мініяцюры, а разгорнутага двухактовага палатна. Зробленага не пасля доўгіх пошукаў, а тэрмінова. І на ўжо гатовую сцэнаграфію расійскага мастака Вячаслава Окунева. Да таго ж яны танцавалі ў нашай мінулай, хай і не надта ўдалай пастаноўцы “Папялушкі” сучаснага расійскага харэографа — і таму імкнуліся не паўтарыць напрацаваную пластыку. Яны справіліся. І гэта галоўнае.

Папялушка — Людміла Хітрова, Прынц — Канстанцін Белахвосцік

Балет пачынаецца з бабулі, што распавядае дзецям казку. І заканчваецца гэтак жа. Сама ж казка — у цэнтры гэтага атачэння. У ёй усё адпавядае знаёмай гісторыі, няма ніякіх неспадзяванак. Класіка, хіба зрэдку з лёгкім неа-, пануе і ў харэаграфіі. Артыстам — зручна. Дзецям і дарослым — цалкам зразумела. Хаця ёсць і некаторыя дробныя цьмянасці, асабліва ў сцэне балю. Чысціню там наводзяць мётламі. Прыбіральшчыцы — жанчыны. Усё як у жыцці. І робіцца гэта непасрэдна перад прыходам гасцей. Раней часу не хапіла? Сёстры і мачаха танчаць сольна. Так і заведзена на балі? Папялушка ў сваёй карэце заязджае адразу ў бальную залу. Можа, менавіта таму з’яўленне прыгажуні мела такі надзвычайны эфект? Ці ўсё ж баляванне ладзіцца ў парку? А вялізная лесвіца — гэта ўваход у палац, куды так нікога і не запрасілі?

Але ж хочацца нейкіх адкрыццяў! Хаця б маленечкіх. Адно з іх у тым, што Папялушка так і не надзела свае крыштальныя чаравічкі. Забылася! Іх панеслі за ёй вучаніцы феі, ды згубілі адзін на зваротным шляху. Цікава, чаму тады прынц шукае Папялушку менавіта па чаравіку? Калі яна не надзела абноўку на баль — можа, памер не падышоў?

Затое які цудоўны гарбуз атрымаўся ў галоўнага мастака тэатра Любові Сідзельнікавай! Праз змены ў лібрэта ёй давялося адаптаваць і дарабляць сцэнаграфію — найперш за кошт відэакантэнту (мастак па камп’ютарнай графіцы — Павел Сувораў). Але ж гарбуз быў зроблены не віртуальны — і настолькі вялізны, каб стаць “грымёркай” з бальнай сукенкай унутры.

У пастаноўцы задзейнічана шмат маладых артыстаў, у тым ліку ў цэнтральных партыях. Ды ўсё ж самымі выйгрышнымі для салістаў здаюцца ролі сёстраў — Злюкі і Крыўлякі, а таксама настаўніка танцаў, які на балі выступае цырымоніймайстрам. Уласна танца там больш, чым у іншых. Бо гэта ж балет, а не пластычны спектакль!

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота з архіва тэатра

Выйсці з “Шыняля” і не спыніцца

Харэаграфічныя спектаклі апошнім часам трывала прапісаліся ў малой зале Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра. У ліпені шэраг папоўніўся “Шынялём” Кірыла Балтрукова паводле аднайменнай аповесці Гогаля.

Шчыра кажучы, твор рускага класіка стаў для спектакля хіба пунктам адліку, месцам старту для далейшых разваг на мове пластыкі і сучаснай харэаграфіі. Але шынялёў (дакладней, паліто) там багата. Прычым усе — двухбаковыя. Іншым словам, пярэкруты.

Такім жа “пярэкрутам” стаў і змест аповесці, максімальна набліжаны да сучаснасці і актуалізаваны для ўсёй сусветнай прасторы, як і належыць спектаклям без слоў. Бо замест звыклай праблематыкі маленькага чалавека ўзнікла іншая — грамадства спажывання, прычым спажывання татальнага. А таксама не менш важная для моладзі тэма — быць як усе ці заставацца белай варонай. Дакладней, шэрай, бо апранутыя артыстамі паліто з аднаго боку шэрыя, а з іншага — чорныя. Але галоўным элементам сцэнаграфіі становіцца... электрачайнік з сінім падсвятленнем. Як сімвал блакітнай мары. Маўляў, гэткі “балет не для чайнікаў”? Ды не, агульны пасыл больш чым ясны і зразумелы нават для тых, хто не лічыць сябе прыхільнікам contemporary dance, аддаючы перавагу традыцыйнаму драмбалету ці проста хіп-хопу. Шукаць жа ў танцах паслядоўнае адлюстраванне гогалеўскага сюжэта — занятак марны. Бо для пастаноўчай групы было важным не пераказаць вядомую гісторыю, а засяродзіць увагу на акрэсленых вышэй тэмах.

Дарэчы, разуменне “Шыняля” як пасткі шопінгу, набыцця непатрэбных рэчаў у час, калі ніхто не паміраe ад іх нястачы, узнікла не ўпершыню. Падобная ідэя была рэалізавана віцебскім рэжысёрам Віктарам Клімчуком у аднайменным спектаклі Белградскага тэатра лялек, што паказваўся ў нас два гады таму на Міжнародным тэатральным фестывалі “Белая Вежа” ў Брэсце. У цяперашняй прэм’еры тэма пашырана да блакітнай мары, здзяйсненне якой выклікае новую. Дык вылучацца з натоўпу — дрэнна? Калі праз матэрыяльны здабытак — дакладна адбяруць. Зайздроснікі. А як праз духоўныя каштоўнасці — ніколі. Цяперашні спектакль — менавіта пра гэта.

У ім, паўтаруся, не трэба шукаць дакладна прапісаны сюжэт. Бо ў цэнтры — думка, якая абмяркоўваецца паступова, лагічна, рознабакова, без боязі паўтораў-лейтматываў. Прычым на мове харэаграфіі, здольнай сказаць больш, чым словы. У пластыцы, магчыма, менш знаходак, чым было ў папярэднім двухактовым спектаклі, што пакуль не выйшаў у публічны пракат. Але артысты працуюць заўзята, з вялікай аддачай, захопліваюць неверагоднай энергетыкай, ансамблевасцю, стыльнай тэхнікай. Гэтым спектакль і заварожвае — і адначасова вымушае задумацца. Ці ж не гэта сёння так прыцягальна і неабходна для моладзі?

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Прэм'ера спектакля “Карова” адбудзецца 7 верасня ў Брэсцкім тэатры лялек.

Ірына Казімірская

Прафесія — запальваць заранічкі

Больш за 20 гадоў Ірына Казімірская кіруе ўзорным харэаграфічным ансамблем "Сузор'е" Бялыніцкага раённага цэнтра культуры. За гэты час балетмайстар вынайшла адметны творчы стыль і педагагічную стратэгію. Як вынік — заззялі дзясяткі зорачак, апантаных танцавальным мастацтвам.

— Ірына Іванаўна, з чаго пачаўся ваш шлях у харэаграфіі?

— У дзяцінстве я марыла стаць гімнасткай: мне лёгка даваліся практыкаванні, якія патрабавалі добрай расцяжкі і гнуткасці. На жаль, магчымасці прафесійна займацца з выкладчыкам не было, таму пачала наведваць школьны танцавальны гурток і выступаць у Доме культуры. Усе раілі мне пайсці вучыцца на харэографа — і пасля дзявятага класа я паступіла ў Магілёўскае дзяржаўнае вучылішча культуры.

— Як з'явіўся калектыў?

— Пасля вучобы я вырашыла размеркавацца ў Бялынічы, бо тут жыла мая мама. Выкладаць пачала ў 2002 годзе, тады і было створана "Сузор'е". Спачатку ансамбль быў невялікім — усяго 12 чалавек. Але паступова да нас далучалася ўсё болей ахвочых танцаваць. Цяпер у нашай камандзе ажно 50 таленавітых зорачак. Вось такі рост!

— З якімі цяжкасцямі сутыкнулася маладая настаўніца?

— За год да майго вяртання ў Бялынічы ў выніку надзвычайнага здарэння былі страчаны ўсе касцюмы. Трэба было набываць усё з нуля. А гэта даволі затратна. Тады ўспомніла, як на ўроку працоўнага навучання ў школе я пашыла сабе сукенку для навагоднага канцэрта. І панеслася! З таго часу мае зорачкі выступаюць ва ўбранні, створаным мною.

Часта ідэі для пашыву прыходзяць выпадкова. Нешта падгледжу ў інтэрнэце, нешта ўбачу ў іншых калектывах. Галоўнае, каб дзецям было зручна выступаць у сваіх касцюмах. Дзякуй бацькам, якія заўсёды дапамагаюць у падрыхтоўцы сцэнічных строяў.

— Як вы знаходзіце сваіх зорачак?

— Іх прыводзяць бацькі. І мы не адмаўляем нікому, у каго ёсць жаданне вучыцца. А пасля некалькіх заняткаў дзеці звычайна самі разумеюць, спраўляюцца з нагрузкамі ці не. Бо рэпетыцый праўда шмат: напярэдадні важных мерапрыемстваў даводзіцца трэніраваць штодня. І ўсё гэта неабходна сумяшчаць са школай! Вядома, не ўсе вытрымліваюць такі рытм. Зусім маленькія пачынаюць свой шлях у свет танцаў з невялікага калектыву-спадарожніка "Зорачка", дзе атрымліваюць базавыя навыкі і веды.

— Калектыў можа пахваліцца дзясяткамі ўзнагарод і бліскучай рэпутацыяй. У чым заключаецца сакрэт поспеху "Сузор'я"?

— Напэўна, шматграннасць нашай дзейнасці мае вырашальнае значэнне. Мы займаемся і партэрнай гімнастыкай, і расцяжкай, і нават акцёрскае майстэрства трэніруем, каб абыгрываць сюжэты ў нумарах. Таксама працуем у розных стылях, каб глядач не стамляўся ад аднастайных выступленняў. Асноўных напрамкаў у нас тры: эстрадны, народны і бальны. Першы — безумоўны фаварыт у дзяцей! Старэйшыя больш любяць працаваць у сучасных танцавальных стылях. І малодшыя не адстаюць: калі бачаць нешта цікавае, адразу кажуць: "Хочам так!"

— На вашу думку, што галоўнае ў працы з дзецьмі?

— Любоў і адказнасць! Мае вучні — маленькія нястомныя зорачкі, часцінкі аднаго цэлага. Нават пры вялікім жаданні я не змагу вылучыць кагосьці аднаго, вызначыць найлепшага. Усе яны жывыя, непасрэдныя, старанныя, цудоўныя пасвойму! Таму я прыкладаю максімум намаганняў, каб яны не толькі фізічна мацнелі, але і станавіліся больш рашучымі і ўпэўненымі ў сабе. А для гэтага неабходна сачыць за псіхалагічнай атмасферай у калектыве. Калі ўзнікаюць канфлікты і розногалоссі, трэба заўсёды абмяркоўваць такія сітуацыі, каб не дапусціць булінгу — цкавання. А яшчэ неабходна кожнаму даваць прастору для творчага самавыяўлення. Мае зорачкі ведаюць, што ў любы момант могуць прапанаваць свае ідэі.

— Вы строгая выкладчыца?

— Мне часта кажуць, што збоку я выглядаю менавіта так. Але вучні хутка разумеюць, як цёпла я стаўлюся да іх, таму адчуваюць сябе свабодна. Я стараюся не страціць баланс паміж патрабавальнасцю і чуласцю. Многія мае выпускнікі часта пішуць і тэлефануюць, кажуць, што сумуюць па нашых занятках. Некаторыя выхаванцы становяцца харэографамі.

— Што чакае калектыў наперадзе?

— Нам безумоўна ёсць куды расці! Першае, што прыходзіць у галаву, — гэта атрыманне звання "народны". Акрамя таго, хочацца часцей прэзентаваць сваю творчасць за межамі рэгіёна і нават краіны.

Віялета ГРЫНКЕВІЧ
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА
і з архіва гераіні

Запаветныя матывы

Творчыя прысвячэнні малой радзіме прэзентавала Ларыса Журавовіч на персанальнай выставе "Захаванае ў сэрцы", што разгарнулася ў Мастацкім музеі імя В.К. Бялыніцкага-Бірулі ў Бялынічах.

Часовая экспазіцыя ўключае больш за 20 работ з фондаў Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя П.В. Масленікава. Раней жыхары сёлетняй культурнай сталіцы гэтых аркушаў не бачылі, аднак многія выяўленыя матывы ім знаёмыя. Менавіта родныя краявіды выступаюць галоўнай крыніцай натхнення для мастачкі. Замілаванне бацькоўскім куточкам, настальгічныя ноткі, вытанчаны густ, віртуознае валоданне тэхнікай — усё гэта вылучае творы Ларысы Журавовіч.

"Я належу гэтай зямлі. І нідзе больш не магу пачувацца так добра", — прызнаецца майстар. Атрымаўшы грунтоўную адукацыю ў тэатральна-мастацкім інстытуце, Ларыса Віктараўна вярнулася са сталіцы ў Бялыніцкі край. З той пары лейтматывам яе графічных аркушаў застаецца прыродная і гісторыка-культурная спадчына малой радзімы, працавітыя і спагадлівыя землякі.

Па матуліных слядах

Біяграфіі некаторых творцаў даводзяць сапраўдную сілу сямейных сувязей. Цудоўны прыклад пераемнасці пакаленняў дэманструюць пружанскія харэографы Валянціна Іскаліева і Аксана Ільюшонак. Маці і дачка стаяць на чале вядомых танцавальных калектываў-спадарожнікаў і шмат гадоў застаюцца адна для адной самымі надзейнымі дарадцамі і памочніцамі.

Тры пакаленні танцавальнай сям'і

УСЁ ПАЧАЛОСЯ З ДЗЯЦІНСТВА

Народны ансамбль танца "Спадчына" быў створаны ў 1979 годзе на базе прафсаюзнага камітэта Пружанскага завода радыёдэталяў. Васіль Пілюцік, натхнёны і таленавіты харэограф, згуртаваў вакол сябе работнікаў прадпрыемства, улюбёных у сцэнічнае мастацтва. Яго справу працягнула Валянціна Іскаліева, якая ўжо 43 гады стаіць на чале калектыву.

— Любоў да танцаў зарадзілася ўва мне яшчэ ў дзяцінстве. Я выступала на імпрызаванай сцэне перад сваякамі падчас сямейных свят, — дзеліцца ўспамінамі Валянціна Іванаўна, — наведвала танцавальны гурток, дзе пазнаёмілася са станком ды класічным танцам, потым паступіла ў Мінскае харэаграфічнае вучылішча.

Маючы добрую падрыхтоўку, Валянціна Іскаліева з упэўненасцю пераняла стырно ў заснавальніка ансамбля. Калектыў пад яе кіраўніцтвам актыўна ўдзельнічаў у канцэртах завода і гарадскіх святах. Паступова каманда ўдасканальвала майстэрства, пашырала рэпертуар. Неўзабаве пасыпаліся ўзнагароды, запрашэнні на рэспубліканскія і нават міжнародныя мерапрыемствы.

— Першай буйной узнагародай стаў дыплом II ступені на конкурсе самадзейнай творчасці Міністэрства радыёэлектроннай прамысловасці СССР у Маскве, — распавядае харэограф. — У 1991 годзе наш ансамбль атрымаў званне "народны". А з 1996-га калектыў працуе на базе гарадскога Дома культуры.

Сёння ў рэпертуары "Спадчыны" беларускія народныя танцы, харэаграфічныя замалёўкі, карагоды, танцы народаў свету і гумарыстычныя нумары. Касцяк калектыву — старшакласнікі і навучэнцы мясцовага каледжа. Але і былыя ўдзельнікі не забываюцца пра ансамбль, заўсёды гатовыя падстаўіць плячо і выйсці на сцэну разам з родным гуртом.

"Спадчына" не стаіць на месцы і дэманструе прафесіяналізм на розных конкурсных і канцэртных пляцоўках. Сёлета калектыў заваяваў дыплом I ступені на IX Міжнародным фестывалі-конкурсе харэаграфічнага мастацтва "Запалі сваю зорку", падрыхтаваў нумар для гала-канцэрта Брэсцкай вобласці ў рамках рэспубліканскага фестывалю "Беларусь — мая песня", выступіў на спартыўна-культурным фестывалі "Вытокі" ў Пружанах.

МАМІНА ШКОЛА

Склад калектыву пастаянна абнаўляўся, таму ў 1984 годзе Валянціна Іскаліева вырашыла стварыць падрыхтоўчую групу, каб "вырошчваць" асноўны склад ансамбля. Першы набор стаў дзіцячым калектывам "Усмешка". А адна з тых удзельніц, Аксана Ільюшонак у будучыні стала кіраўніцай гурта.

— У мяне не было іншага шляху, як пайсці па слядах мамы. З малых гадоў я бавіла час побач са сцэнай, пакуль яна рыхтавала новыя праграмы і канцэрты для "Спадчыны", а неўзабаве я і сама стала часткай творчай сям'і, — успамінае Аксана Васільеўна. — Ужо ў першым танцавальным нумары "Беларускія малюнкі" мяне паставілі саліісткай. Нягледзячы на юны ўзрост (мне было пяць гадоў), я добра адчувала рытм і запамінала рухі. Мабыць, ужо тады было пасеяна зерне для таго, каб рана ці позна я стала кіраўніком гэтага калектыву.

Шчыраваць з двума вялікімі калектывамі Валянціне Іскаліевай было складана, і ў 1990 годзе на дапамогу прыйшла яе вучаніца Вольга Серада. Адбыліся вялікія змены: былі створаны ўзроставыя групы, рэпертуар узбагаціўся беларускімі народнымі танцамі... Але галоўным дасягненнем стала атрыманне звання "ўзорны". І з 2006-га калектыў пачаў жыць пад новай назвай — узорны ансамбль народнага танца "Круцёлачкі".

— Увесь гэты перыяд я кіравала танцавальным калектывам мясцовага тэхнікума і паралельна выступала разам са "Спадчынай". Калі ў 2012 годзе Вольга Аляксандраўна прапанавала стаць на чале "Круцёлачак", я адчувала вялікую адказнасць, была ўсцешаная такім даверам. Дзіцячыя жаданні і мары, аказваецца, спраўджваюцца! — прызнаецца Аксана Ільюшонак.

З 2022 года ў "Круцелачак" новы віток творчага развіцця. Ансамбль годна прадставіў сябе на Міжнародным фестывалі-конкурсе харэаграфічнага мастацтва "Запалі сваю зорку" ў Паўладары, з'ездзіў на гастролі ў Пензу і атрымаў запрашэнне на выступленне ў Казані.

Народны ансамбль танца "Спадчына"

РАЗАМ — ДА НОВЫХ ВЯРШЫНЬ

Цяпер маці і дачка плённа працуюць у тандэме: раяцца адна з адной, дзеляцца меркаваннем і ставяць сумесныя вялікія пастаноўкі.

— Мы выхавалі ўжо некалькі пакаленняў танцораў! — падкрэслівае Валянціна Іскаліева. — Радасна назіраць, як, прыйшоўшы яшчэ дзіцем у "Круцёлачкі", многія працягваюць свой танцавальны шлях у "Спадчыне". Некаторыя пасля атрымліваюць профільную адукацыю і становяцца прафесійнымі танцорамі і харэографамі-пастаноўшчыкамі.

— Важна, каб нават у пачатку свайго шляху дзеці маглі адчуваць гледача, — дапаўняе Аксана Васільеўна. — Сыходзячы за кулісы, юныя артысты разумеюць, годна выступілі ці ім варта недзе дапрацаваць. Ансамблі становяцца важнай часткай жыцця хлопчыкаў і дзяўчынак: тут яны знаходзяць сяброў, вучацца ўзаемадапамозе і падтрымцы, сустракаюць каханне, а некаторыя нават потым бяруцца шлюбам.

Па танцавальным шляху пайшлі і дзеці Аксаны Ільюшонак: старэйшы сын атрымаў адукацыю харэографа ў Гродзенскім дзяржаўным каледжы мастацтваў, сярэдні займаецца ў "Круцёлачках", а дачушка марыць пераняць маміну прафесію.

Сёлета народны ансамбль танца "Спадчына" і ўзорны ансамбль танца "Круцёлачкі" адзначаюць круглыя даты: 45 і 40 гадоў з дня заснавання. Кіраўніцы ўпэўненыя, што ў калектываў яшчэ ўсё наперадзе. Тым больш яны стаяць на тым, што эстрада — гэта даніна моладзе, а вось тое, што выйшла з народа, — гэта назаўжды!

Народны ансамбль танца "Спадчына" падчас удзелу ў Рэспубліканскім фестывалі "Беларусь — мая песня"

Народны ансамбль танца "Спадчына" пад кіраўніцтвам Валянціны Іскаліевай атрымаў дыплом як найлепшы калектыў аматарскай творчасці ў Пружанскім раёне (2022 год)

Ульяна КАСЦЮНІНА
Фота з архіваў гераінь

(Працяг. Пачатак у “К” № 32, 2024)

Палац Радзівілаў-Солтанаў. Напалеон Орда, 1860-я

Шляхі будучага майстра

Працягваем знаёміць чытачоў “К” з таямніцамі жыццяпісу Вінцэнта Дмахоўскага, пачынальніка беларускага гістарычнага пейзажа. Гэтым разам гаворка пойдзе аб тым, якое дачыненне мае сям’я Дмахоўскіх да Дзятлава і Слоніма.



Вінцэнт Дмахоўскі. Алена Скірмунт, 1847

Касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі ў Дзятлаве

З ФАЛЬВАРКА Ў ПАЛАЦ

Вінцэнт нарадзіўся 14 ліпеня 1807 года ў фальварку Гаўя, блізу мястэчка Іўе. Праз год на свет з’явіўся яго брат Зянон, і неўзабаве сям’я пакінула не надта ўрадлівыя пяскі на беразе звілістай ракі Гаўі і перабралася ў Дзятлава. І не абы-куды, а ў палац Радзівілаў-Солтанаў. Прытым не “на госці”. Дмахоўскія становяцца арандатарамі маёнтка. Узгадаем, што бацькі Вінцэнта былі не звычайнымі шляхіцамі-грэчкасеямі, а паходзілі з вельмі старых беларускіх радоў. Іх сваякі адыгрывалі важныя ролі і ў часы Вялікага Княства Літоўскага, і пазней.

У старадаўнім палацы Радзівілаў-Солтанаў нарадзіліся сёстры Вінцэнта. 10 (22) жніўня 1809 года — Юстына, 29 лістапада (10 снежня) 1810 — Канстанцыя Крысціна. Дарэчы, у дзень, калі ў касцёле Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі хрысцілі Юстыну, там жа адбылося дапаўненне хросту яе братоў. Так Зянон Напалеон атрымаў трэцяе імя Вінцэнт, з якім і прайшоў праз усё жыццё. Цікавае супадзенне: у 1793—1797 гадах у гэтым жа палацы жыў са сваёй сям’й будучы настаўнік Вінцэнта Дмахоўскага мастак Ян Рустэм.

Як завяршыўся тэрмін арэнды, каля 1812 года, Дмахоўскія зноў сабралася ў дарогу. Сям’я паехала ў фальварак Парэчча, што месціўся на беразе Шчары блізу Слоніма.

НА БЕРАГАХ ШЧАРЫ

Пра гэты перыяд, які расцягнуўся на 6-7 гадоў, вядома няшмат. Дмахоўскія сталі парафіянамі слонімскага касцёла Святога Андрэя. У 1813-м у Ігната і Марыяны нарадзіўся сын, якому пры хросце далі імя Уладзімір Казімір. Праз чатыры гады на свет прыйшоў Караль Кутэрмар Ігнат.

У гэты самы час бацькі адпраўляюць Вінцэнта ў слынныя Шчучынскі піярскі калегіум. Туды ж трошкі раней паступіў будучы паэт-філарэт Юльян Корсак, што стаў адным з найбліжэйшых сяброў Дмахоўскага мастак Ян Рустэм.

Як завяршыўся тэрмін арэнды, каля 1812 года, Дмахоўскія зноў сабралася ў дарогу. Сям’я паехала ў фальварак Парэчча, што месціўся на беразе Шчары блізу Слоніма.

НА НОВАЕ МЕСЦА

Маёнтак Нагародавічы хоць і быў не надта вялікі, але меў багатую гісторыю. Адна з першых яго згадак прыпадае на пачатак XVII стагоддзя. Як адзначае краязнаўца Леанід Лаўрэш, з 20 па 26 ліпеня 1617 года ў Нагародавічах адбылася 1-я генеральная капітула (кангрэгацыя) базыльянскіх манастыроў ВКЛ. Былі склікаены старцы з усіх кляштараў, а менавіта з Віленскага, Наваградскага, Мінскага, Жыровіцкага, Быценскага.

Далейшая гісторыя маёнтка — ланцуг бясконцых змен уласнікаў. То ім валодалі Булгакі (продкі аднаго з піянераў беларускай фатаграфіі Яна Булгака), то Крывіцкія, то Сідаровічы, то Тызенгаўзы і Мараўскія. І вось у 1820 годзе маёнтак пераходзіць да Дмахоўскіх. Ажно да 1939-га.

Вось толькі Ігнат на свеце не зажыўся і каля 1824-га сканаў. Памёр у тым годзе і шаснаццацігадовы Зянон. З метрыкі вядома, што пахавалі яго ў Нагародавічах. Пэўна, так быў пакладзены пачатак родавых могілак Дмахоўскіх, што былі знойдзены намі падчас аднаго з суботнікаў. Невядома, што здарылася з бацькам, бо метрыкі смерці знайсці не ўдалося.

Вінцэнт жа два наступныя гады праводзіць у Мінску, штудзіруючы права пад вокам дзядзькі Міхала Дэспат-Зяновіча, былога губернскага маршалка. Але не ўсё было ў тыя часы такім сумным.

Юнацтва — шчаслівы час шумных сяброўскіх сустрэч, мар і надзей. У сярэдзіне 1820-х Вінцэнт становіцца душой кампаніі віленскіх студэнтаў, якая складалася з Юльяна Корсака, Антонія Адынца, Ігната Ходзькі, Ігната Дамейкі. Усе яны або жылі побач з Нагародавічамі, або сталі з цягам часу адзін аднаму сваякамі. Адынец у сваіх успамінах згадваў маці Дмахоўскага: яна знайшла агульных з ім сваякоў, і таму яны жартам звярталіся адно да аднаго “кузін-кузіна”. Згадваў і яе шматлікіх дзяцей, сярод якіх вылучыў Вінцэнта, бо той двойчы на тыдзень арганізоўваў танцавальныя вечарыны ў Корсакавай Страле.

У СТУДЭНЦКІМ ГОРАДЗЕ

У 1826-м Вінцэнт паступае ў Віленскі ўніверсітэт на факультэт літаратуры і вольных мастацтваў. Тут лёс зводзіць яго са знакамітым мастаком Янам Рустэмам, які ачольваў кафедру жывапісу. Сярод яго выпускнікоў былі Казімір Бахматовіч, Ян Дамель, Адам Шэмеш, Юзаф Крашэўскі, Юзаф Аляшкевіч, Канут Русецкі, Валенці Ваньковіч ды іншыя выбітныя мастакі.

Вінцэнт Дмахоўскі становіцца адным з найлепшых вучняў Рустэма, а пазней і крытыкам. Верагодна, у гэты час згаданы Казімір Бахматовіч, адзін з першых беларускіх літографаў, намаляваў вядомы партрэт Вінцэнта Дмахоўскага.

На перавозе. Відарыс Пінска. Вінцэнт Дмахоўскі, 1847

Уладзіслаў Сыракомля. Максімілі́ян Фаянс, пасля 1860

Руіны замка ў Гальшанах. Вінцэнт Дмахоўскі, 1853

Партрэт Саламеі Дмахоўскай. Вінцэнт Дмахоўскі, 1856

МАЛАДАЯ СЯМ’Я

Завяршыўшы вучобу ў 1829-м, малады мастак пачынае пошук спадарожніцы жыцця. І 3 (15) лютага 1830 года Вінцэнт бярэ шлюб з Саламеяй, дачкой былога вайскоўца Ігната Арлоўскага і Апалоніі Свяршчэўскай. Першай у пары нарадзілася дачка Галіна Марыяна Апалонія — 5 (17) студзеня 1831 года ў Вільні. За ёй 5 (17) верасня 1833 года ў Нагародавічах з’явілася на свет Марыя Аляксандра. У 1836-м там жа нарадзілася Адэлія Юстына.

Гэтыя звесткі запаўняюць вялізную пустку ў біяграфіі мастака. Раней лічылася, што пасля паразы паўстання 1830—1831 ён сем гадоў туляўся па чужыне, чакаючы амністыі. Дык не. У 1831-м далучыўся да ўланскага палка, браў удзел у Варшаўскім сойме ад Гарадзеншчыны, а 4 кастрычніка 1831 года атрымаў намінацыю на чын падпаручніка. Пасля паразы перайшоў мяжу з Прусіяй. Тут, у Круляўцы, лёс звёў яго са старым сябрам Антоніем Адынцом, у якога Дмахоўскі стаў сведкам на шлюбе 5 ліпеня 1832 года. Як бачым, вайна для мастака, на шчасце, скончылася хутка.

У лістападзе (23 кастрычніка па старым стылі) 1837 года Вінцэнт, маючы ў кішэні 14,5 рублёў срэбрам, з пакуль яшчэ маленькай сям’ёй перабіраецца з Нагародавічаў у Вільню. Да такога смелага ўчынку, як пісаў Уладзіслаў Сыракомля, яго падштурхнула сляпая вера, што літвіны, якія гэтак жа, як і ён сам, любяць мастацтва, не дадуць сярод сябе, у сваёй сталіцы, згінуць айчыннаму таленту. Пра тое, ці спраўдзіліся спадзевы мастака, распавядзем у наступнай частцы.

Зміцер ЮРКЕВІЧ

У госці да Сымоніхі і Дрыбшы

“Дрыбінскія таржкі” чарговы раз збіраюць гасцей з розных куткоў Беларусі і замежжа. Сёлета рэгіянальны фестываль народнай творчасці, промыслаў і рамёстваў прымеркаваны да 100-годдзя Дрыбінскага раёна.

Свята мае на мэце адраджэнне, захаванне і папулярызацыю традыцый ды развіццё пераемнасці між пакаленнямі. Гісторыя таржкоў бярэ пачатак яшчэ ў XVIII стагоддзі, калі праз Дрыбінскую зямлю праходзіў адзін з важных гандлёвых шляхоў. Сучасны ж фестываль ладзіцца з 2011-га. Ён стаў сапраўдным культурным брэндам рэгіёна. Сімвалам падзеі нязменна з’яўляюцца валёнкі: гэты край здаўна славіцца шапавальствам. Творчасць мясцовых майстроў валяльнага промыслу ўнесеная ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Галоўнымі героямі свята выступаюць хлебасольная Сымоніха і дабрадушны Дрыбша, якія сустракаюць гасцей ля імправізаванай мытні. Перайсці мяжу яны прапануюць на возе, на лыжах ці любым іншым незвычайным спосабам. За спрыт і крэатыўнасць візіцёраў частуюць ласункамі ад тутэйшых кулінараў. На цэнтральнай вуліцы разгарнуўся калярытны горад майстроў з выставамі народных умельцаў, тэматычнымі падворкамі, рамеснымі майстар-класамі і гульнявымі пляцоўкамі. Чакае наведвальнікаў і літаратурная гасцёўня.

У першы дзень акцэнт зроблены на дзяцей і моладзь. Для іх зладзілі фестываль фарбаў, творчыя конкурсы, кінапраглад пад адкрытым небам, дыскатэку ды іншыя забавы. На заўтра запланаваныя святочнае шэсце, гала-канцэрт “Ад вытокаў да сучаснасці”, выступленне ансамбля “Песняры” і светлавое шоу. Завершыцца фэст познім вечарам вогненным прадстаўленнем, салютам і дыскатэкай.

Па старонках календара

■ **16 жніўня** з’явіўся на свет Віталь Паўлавіч Чацверыкоў (1933—1983) — кінарэжысёр. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Народны артыст Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР. Зняў дакументальныя фільмы “Высокае напружанне”, “Беларуская рапсодыя”, “Пакараны смерцю ў сорак першым” і інш. Стварыў мастацкія эпічныя карціны пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны “Руіны страляюць...” і “Полымя”, у якіх іграваыя эпізоды спалучаны з кадрамі кінахронікі і архіўных дакументаў.

■ **20 жніўня** 1936 года нарадзілася архітэктар Галіна Уладзіміраўна Ласкавая. Сярод асноўных работ (у аўтарскім калектыве) — будынкі інстытута культуры, музычнага вучылішча імя Глінкі.

■ **20 жніўня** 1942 года дзень нараджэння Вячаслава Вячаслававіча Шамшура — мастака, мастацтвазнаўцы, аднаго з першых даследчыкаў творчасці Малевіча, Шагала, Лісіцкага і іншых мастакоў паслярэвалюцыйнага Віцебска.

■ **21 жніўня** 1923 года з’явіўся на свет Атар Міхайлавіч Дадышкіліяні — расійскі і беларускі балетмайстар, оперны рэжысёр. Заслужаны артыст РСФСР, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. З 1965 года працаваў галоўным балетмайстрам, з 1972-га галоўным рэжысёрам Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі. Першы пастаноўшчык на беларускай сцэне балетаў “Аліпійская балада”, “Выбраннніца” і “Тыль Уленшпігель” Я. Глебава, “Пасля балю” Г. Вагнера.

■ **22 жніўня** нарадзіўся Ігнат Цярэнцьевіч Буйніцкі (1861—1917) — акцёр, рэжысёр, тэатральны дзеяч, стваральнік нацыянальнага прафесійнага тэатра, удзельнік літаратурнага жыцця. Яшчэ пры жыцці яго называлі бацькам беларускага тэатра.

■ **22 жніўня** 1936 года — дзень нараджэння Ірыны Дзянісаўны Дзідзіўэнка, артысткі балета, заслужанай артысткі БССР. У 1959—1975 гг. яна была саліткай Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі.

■ **22 жніўня** з’явіўся на свет Уладзімір Дзмітрыевіч Станкевіч (1923—2008) — рэжысёр. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Сярод яго прац тэлеспектаклі “Слова пра паэта” і “Ля сіняй бухты” Б. Бур’яна, “Машэка” Е. Міровіча; дакументальныя тэлефільмы “Знаёмцеся, Беларусь”, “Біяграфія маёй рэспублікі” (5-я серыя); тэлевізійны мастацкі фільм “Мы — хлопцы жывучыя” (паводле аповесці і па сцэнарыі І. Сяркова). Таксама Уладзімір Станкевіч стварыў шэраг тэлевізійных перадач з серыі “Творчыя партрэты”, музычных перадач “Блакітны агеньчык”.

АФІША з 16 па 23 жніўня

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792,
8 017 3271166

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• **Святочная праграма да Дня народнага адзінства на ваенна-гістарычным комплексе "Старая мяжа" (п. Станькава). 17 верасня, 13.00 – 17.00.** Уваход вольны.
• Часовая экспазіцыя **"Адзінай памяці верныя"**, прысвечаная 80-годдзю вызвалення Беларусі.
• Часовая экспазіцыя **"Музей. Час. Памяць"**, створаная ў рамках праекта "Адкрытыя фонды".
• У продаж паступілі сертыфікаты на наведванне экспазіцыі музея.
• Інтэрактыўная праграма **"Салдаты неба"**. Пляцоўка самалёта Лі-2. Запісацца можна па тэлефоне 8 017 2030792. **Праводзіцца па нядзелях да верасня.**
• Часовая экспазіцыя **"Мы набліжалі Перамогу"**. Сумесны выставачны праект з дзяржаўным прадпрыемствам "Белгеадэзія".

Падрабязнасці ў сацыяльных сетках і на сайце **warmuseum.by**.

УНП 100235472



МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а,
тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Выстава жывапісу XX стагоддзя **"Мая Радзіма — Беларусь"** з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея, прысвечаная 80-годдзю вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. **Да 5 верасня.**
• Праграма **"Кафляныя «люстэркі» шляхецкай сядзібы"**. **Праводзіцца заўсёды.**
• Квэст **"Таямніцы старажытнай сядзібы"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
• Квэст **"Пошукі мінулага"**. **Праводзіцца заўсёды.**
• Экскурсія **"Інтэр'ер шляхецкай сядзібы"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
• Экскурсія **"Шлях мастака Валенція Ваньковіча"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
• Экскурсія **"Сядзібны партрэт"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771



НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20,
тэл.: 8 017 3970163
(экскурсійнае бюро)

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Экспазіцыя **"Ю. Пэн, Я. Кругер. Мастацкія школы Беларусі"**. Выставачны корпус, вул. Карла Маркса, 24, паверх 3, залы 1 і 2. **Да 18 жніўня.**
• Персанальная выстава **"Прастора святла і колеру: акварэль"** члена Беларускага саюза мастакоў, заслужанага настаўніка Рэспублікі Беларусь, уладальніка ордэна Беларускай Праваслаўнай царквы свяціцеля Кірылы Тураўскага Яўгена Саковіча. **Да 2 верасня.**
• Выстава **"Сімвалы, атрыбуты і алегорыі ў мастацтве Беларусі XVII—XIX стст."**. **Да 13 кастрычніка.**
• Экскурсіі: **"Самыя-самыя..." (6+)**, **"Якога колеру зіма?" (6+)**, **"Казкі Усходу" (10+)**, **"Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма" (10+)**, **"Партрэты даўнія мінулых пакаленняў..." (10+)**, **"Пяць моў кахання" (16+)**, **"Жаночы партрэт" (16+)**, **"Мінск у музеі" (16+)**. **Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• Канцэрт класікі рока **"Дым над вадой" (12+)**. Жывы гук. Канцэрт у цемры. Імпрэза праводзіцца на вул. Валгаградскай, 35. **16 жніўня ў 19.00.**
• Канцэрт класікі рока **"Летні фрэш" (12+)**. Жывы гук. Канцэрт у цемры. Імпрэза праводзіцца на вул. Валгаградскай, 35. **23 жніўня ў 19.00.**

УНП 100377901

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

Палацавы ансамбль

• Тэатралізаваная экскурсія **"Таямніцы палацавых прыёмаў"**. **17—18 жніўня з 13.00.**
• Культурнае мерапрыемства **"Тэатральная замалёўка"**. **17, 18, 24, 25, 31 жніўня. Пачатак 12.00, 13.00, 14.00.**
• Фестываль камернай музыкі **"Даўніна і сучаснасць"**. Беларуская піяністка Таццяна Старчанка і ансамбль салістаў . Тэатральная зала. **24-25 жніўня з 14.00.**
• Часовая экспазіцыя **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны"**. **Да 13 кастрычніка.**
• Выставачны праект **"Прыгажосць і мода. XIX—XXI стагоддзі"**. **Да 20 кастрычніка.**
• Экспазіцыя **"Цудатворная Жыровіцкая ікона Божай Маці ў камені"**. Аўтар праекта А. Папельскі. Малая выставачная зала. **Да 18 лістапада.**
• Выстава **"Маджарскія: армянскі род у гісторыі Беларусі"**. Калекцыйныя залы "Слуцкія паясы". **Да 31 снежня.**
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара"**. **У складзе пастаяннай экспазіцыі.**
• Квэст **"Палацавыя таямніцы"**.
• Віртуальныя выставы: **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны"**, **"Нясвіж — здабытак сусветнай культуры"**, **"Разбуральны след вайны ў архітэктуры Нясвіжа"**, **"Шэдэўры калекцыі і ўнікальныя артэфакты музея-запаведніка «Нясвіж»"**.
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

Інфармацыйна-касавы цэнтр (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)

• Часовая экспазіцыя твораў сучаснага мастака Маргарыты Маніс **"Мінск у Нясвіжы"**. **Да 9 кастрычніка.**

Архітэктурны помнік "Слуцкая брама" (г. Нясвіж, вул. Слуцкая)

• Часовая экспазіцыя **"Колер і святло. З гісторыі вітражнага мастацтва"** з фондаў музея-запаведніка. **Да 30 верасня.**

Пастаянныя экспазіцыі

• **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII — 1-й палове XIX ст."**.
• Калекцыя гадзіннікаў XIX—XX стагоддзяў **"Культура часу"**. З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы

• Квэсты: **"Безаблічны артэфакт"**, **"Карта сямі каралеўстваў"**, **"Музейны дэтэктыў"**, **"Музейнае расследаванне"**.
• Культурныя мерапрыемствы: **"Прыём у княгіні"**, **"Дзень нараджэння ў ратушы"** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў"** (да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **"Музейка аб музеі"** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **"Выкрунтасы"** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці па тэлефонах 8 01770 20602, 8 01770 20660 або на сайце **niasvizh.by**.

УНП 600207920

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37,
тэл.: 8 0222 650203,
8 0222 658800

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Art-lectorium **"Зразумелае мастацтва"**. **Праводзіцца заўсёды.**

Падрабязней на сайце **artmuseum.by** альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800.

УНП 100377771

*

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.
Тэлефоны: **8 017 3970163**, **8 025 6677819**.

УНП 100377771

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г. п. Мір, Карэліцкі р-н,
Гродзенская вобл.,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Квэст **"Таямніца двух куфраў"**. **17 жніўня 15.30.**
• Фотавыстава **"Забытыя героі: Першая сусветная вайна на фотаздымках Паўла Веліканава"**. Падрыхтавана на аснове наяўнай у фондах Яраслаўскага дзяржаўнага гісторыка-архітэктурнага і мастацкага музея-запаведніка калекцыі фатаграфій вайскоўца 30-га Сібірскага стралковага палка Паўла Веліканава. **Да 29 жніўня.**
• Касцюміраваная выстава **"Гісторыя ў асобах"** Цэнтральнага музея васковых фігур Санкт-Пецярбурга. **Да 30 верасня.**
• Экспазіцыя **"Войны XX стагоддзя. Гета ў Мірскім замку"**.
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
• Сямейная квэст-экскурсія **"Легенды і паданні Мірскага замка"**.
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце"**, **"Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст."**, **"Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст."**, **"Печы з каробкавай кафлі XVI—XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў"**.

УНП 590201541

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

Мінскі р-н, Астрашыцка-Гарадоцкі с/с, в. Аколіца,
вул. Іванаўская, 17б,
тэл.: 8 017 5074468

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• **Батлеечны спектакль. Праводзіцца заўсёды.**
• Майстар-клас **"Саломапляценне"**. **Праводзіцца заўсёды.**
• Майстар-клас **"Лялька-мотанка"**. **Праводзіцца заўсёды.**
• Майстар-клас **"Ткацтва"**. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771



НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Някрасава, 3,
тэл.: 8 017 2350331,
час працы: серада — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выстава работ з фонду НЦСМ **"Візуалізацыі. Паверхня і знак"**. **Да 5 верасня.**
• Выстава **"Лета — маленькае жыццё!"**, падрыхтаваная з фондавых калекцый НЦСМ. **Да 5 верасня.**

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47,
тэл.: 8 017 2350332, 8 017 3990978,
час працы: аўторак — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выстава **"Слоўнікавы запас"**. **Да 6 кастрычніка.**

УНП 192543414

Ідзе падпіска

Газета "Культура":	Індывідуальны **63875** 1 мес. – 15,43 руб.	Ведамасны **638752** 1 мес. – 25,04 руб.
Падпіска на газету "Культура" з мабільнага тэлефона	Ільготны (для юрыдычных асоб, якія афармляюць падпіску на адрас сваіх супрацоўнікаў і пенсіянераў) **63879** 1 мес. – 17,38 руб.	
Часопіс "Мастацтва":	Індывідуальны **74958** 1 мес. – 20,84 руб.	Ведамасны **749582** 1 мес. – 40,84 руб.
	Ільготны (для юрыдычных асоб, якія афармляюць падпіску на адрас сваіх супрацоўнікаў і пенсіянераў) **74986** 1 мес. – 22,97 руб.	

2006 2010 2022

КУЛЬТУРА

Сайт: **kultura-info.by**
E-mail: **kim@kultura-info.by**

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА). Выдаецца на беларускай мове.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Рэдакцыя газеты "Культура": Галоўны рэдактар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактары аддзелаў — Віктар ГАЎРЫШ, Данііл ШЭЙКА.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефон: 8 017 2860797.
Тэлефон-факс: 8 017 3345741.
Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.
Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.

Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879.

Ільготныя на паўгоддзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %).

Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %).

Рознічны кошт — па дамоўленасці.

* — матэрыял на правах рэкламы.

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

Меркаванне аўтара можа не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Набыць газету ў Мінску можна ў крамах "Белдрук" на праспекце Незалежнасці, 44, 48, 98, на праспекце Пераможцаў, 5, на вуліцы Карла Маркса, 38, на вуліцы Кальварыйскай, 4а, у падземным пераходзе на плошчы Перамогі.

Падпісана ў друк 15.08.2024 у 16.00. Замова № 1771. Наклад 3320.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

© "Культура", 2024.